## У Беларусі зменены ўмовы прэміравання кіраўнікоў арганізацый-даўжнікоў

У Беларусі зменены ўмовы прэміравання кіраўнікоў арганізацый, якія маюць завінавачанасць перад бюджэтам. Прэзідэнт Беларусі 6 жніўня падпісаў Указ № 405, якім унесена змяненне ва Указ ад 13 жніўня 1996 года № 292 «Аб прадастаўленні юрыдычным асобам адтэрміноўкі па выплаце завінавачанасці па падатках і пені».

Указам № 292 ад 13 жніўня 1996 года забаронена выплачваць прэміі кіраўнікам і галоўным спецыялістам (іх намеснікам) арганізацый, якія маюць завінавачанасць перад бюджэтам.

У гэты ўказ унесена змяненне, згодна з якім забарона не будзе распаўсюджвацца на арганізацыі, якім рашэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прадастаўлена адтэрміноўка (растэрміноўка) пагашэння завінавачанасці па плацяжах у бюджэт, эканамічных санкцыях і пенях. Пры гэтым абавязковай умовай з'яўляецца строгае выкананне выплаты бягучых плацяжоў у бюджэт.

У выпадку пазбаўлення права на адтэрміноўку (растэрміноўку) забарона на налічэнне і выплату прэмій службовым асобам будзе дзейнічаць.

Указ уступае ў сілу праз тры месяцы з дня яго падпісання.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### УКРАІНА ПААБЯЦАЛА МВФ ПАВЯЛІЧЫЦЬ КОШТЫ НА ГАЗ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА ЯШЧЭ НА 50 %

**Урад Украіны і Міжнародны валютны фонд апублікавалі меморандум, паводле якога Кіеў павінен паступова павялічыць кошты на газ для насельніцтва і прадпрыемстваў камунальнай цеплаэнергетыкі датуль, пакуль унутраныя кошты на газ і кошты імпарту не дасягнуць парытэту. Пра гэта паведамляюць інфармагенцтвы.**

«Дадатковае павышэнне коштаў на 50 % для насельніцтва запланавана на 1 красавіка 2011 года», — гаворыцца ў дакуменце. У далейшым кошты будуць мяняцца кожныя паўгода, пакуль кошт газу для ўсіх катэгорый не зраўняецца з коштам імпарту.

Характэрна, што ва Украіне 1 жніўня 2010 года кошты на газ для насельніцтва ўжо былі павышаны ў паўтара раза. Таксама на 50 % узраслі кошты на прыродны газ для прадпрыемстваў цеплаэнергетыкі, якія забяспечваюць ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне насельніцтва, што цягне за сабой павелічэнне коштаў і тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі.

Акрамя таго, паводле праграмы супрацоўніцтва Украіны з МВФ, украінскія ўлады абавязаны павялічыць патрабаванні для пенсіі стаж і зраўняць тэрміны выхаду на пенсію жанчын і мужчын. З 2011 года ва Украіне пачнецца працэдура павелічэння пенсійнага ўзросту для жанчын да 60 гадоў. Кожны год пенсійны ўзрост для жанчын павінен павялічвацца на паўгода.

### ГРАМАДЗЯНСТВА ФРАНЦЫІ БУДУЦЬ ПАЗБАЎЛЯЦЬ ЗА ШМАТЖЭНСТВА І ЖАНОЧАЕ АБРАЗАННЕ



**Міністр унутраных спраў Францыі Брыс Артфэ прапанаваў пазбаўляць грамадзянства імігрантаў з мусульманскіх краін, якія допускаюць шматжэнства, жаночае абразанне і «іншыя сур'ёзныя парушэнні». Пра гэта піша The Daily Telegraph.**

Паводле слоў Артфэ, пакаранне ў выглядзе пазбаўлення грамадзянства павінна ўжывацца не толькі ў дачыненні да імігрантаў, але і да іх нашчадкаў, якія нарадзіліся на тэрыторыі Францыі. Як мяркуе міністр, падобныя меры варта ўжываць да тых, хто працягвае кіравацца традыцыямі тых месцаў, адкуль прыбылі яны самі ці іх продкі.

Выступленне міністра рушыла ўслед за допытам мусульманіна з французскім грамадзянствам, выхадца з Алжыра, якога вінавацяць у серыі згвалтаванняў. Іміграту таксама ставіцца ў віну рэгулярнае ўхіленне ад выплаты аліментаў за 15 дзяцей, народжаных ад чатырох розных жанчын.

### У КІТАІ З-ЗА АПОЎЗНЯЎ ЗНІКЛІ 1300 ЧАЛАВЕК, АД ПАВОДКІ ПАЦЯРПЕЛІ БОЛЬШ ЗА 20 ТЫСЯЧ



**Колькасць пацярпелых ад апоўзняў і паводкі ў паўночна-заходнім Кітаі перавышае 20 тысяч чалавек, перадало ў панядзелак РІА «Навіны» са спасылкай на кітайскія крыніцы.**

Згодна з папярэднімі падлікамі, колькасць у той ці іншай меры пацярпелых ад паводак можа дасягаць 20 тысяч 227 чалавек з амаль 135 тысяч жыхароў павета. Паводле інфармацыі выратавальнікаў, учора было вядома пра 127 загінулых, яшчэ амаль 1,3 тысячы чалавек лічацца зніклымі без вестак. Колькасць параненых перавышае 120 чалавек, дзясяткі з іх — у цяжкім стане.

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне намесніку начальніка фінансава-эканамічнага ўпраўлення Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Кузьміч Наталлі Рыгораўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні намесніку начальніка фінансава-эканамічнага ўпраўлення Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Кузьміч Наталлі Рыгораўне ў сувязі з напаткаўшым яе непапраўным горам — смерцю БАЦЬКІ.**

Открытое акционерное общество
«Минский подшипниковый завод» извещает
своих акционеров о проведении **25 августа 2010 года**
внеочередного собрания акционеров

**Повестка дня:**

1. О реорганизации открытого акционерного общества «Минский подшипниковый завод» путем присоединения к нему УП «РИПРЭН» ОАО «МПЗ».

Собрание состоится по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Жилуновича, 2, актовый зал ЛБК, начало собрания в 15.00.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по указанному выше адресу на центральной проходной в кабинете инспектора по жилью ОСБО в период с 20.08.2010 г. с 10.00 до 16.00 (перерыв с 11.50 до 12.25) в день проведения собрания — по месту проведения собрания.

Регистрация участников с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания по предъявлению документа, удостоверяющего личность.

Справки по тел. 246 70 31, 246 70 66.

УНП 100103346

# НА ПРУЖАНШЧЫНЕ — СТО ТЫСЯЧ, НА БРЭСТЧЫНЕ — МІЛЬЁН!

**Напрыканцы мінулага тыдня хлебаробы Пружанскага раёна намалацілі 100 000 тон збожжа. З гэтай нагоды іх павіншаваў старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар.**

Першымі ў раёне намалацілі тысячу тон збожжа камбайнеры Леанід Хлебнік і Мікалай Давыдзенка з ААТ «Ружаны-Агра». А цяпер на рахунку экіпажа камбайна «ACROS-503» амаль паўтары тысячы тон. Болей за тысячу тон убраў і сямейны экіпаж Васіля Зубені і яго сына з гэтай жа гаспадаркі. Сярод вадзіцеляў ААТ «Ружаны-Агра» на сёлетнім жніве вызначыліся Уладзімір Зубеня і Юрый Давыдзенка.

А земляробы ААТ «Айчына» Пружанскага раёна ў мінулыя выхадныя справілі дажынкі. У гаспадарцы ўбрана 3300 гектараў збожжавых, атрымана ўраджайнасць больш за 40 цэнтнераў з гектара.

У выхадныя дні статыстычная служба аграрнай галіны Брэсцкай вобласці адзначыла лічбу намалоту збожжа ў мільён тон. У нядзелю і панядзелак лік пайшоў на другі мільён. Усё больш гаспадарак паўднёвых раёнаў адзначаюць дажынкі. Сярод іх і ААТ «Белавежскі» Камянецкага раёна, дзе сярэдняя ўраджайнасць збожжавых склала 48,4 цэнтнера з гектара. Статысячны рубеж пераадолелі таксама хлебаробы Баранавіцкага раёна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЧЫНОЎНІКІ ПРАВЯЛІ РАБОТУ НАД ПАМЫЛКАМІ

**У выкананне даручэння Прэзідэнта Беларусі, аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам прааналізавалі праблемы, выяўленыя падчас першага этапа маніторынгу стану работы органаў улады па вырашэнні вострых сацыяльна значных пытанняў насельніцтва і павышэнні якасці работы са зваротамі грамадзян. Становішча спраў, нагадаем, вывучала створаная па даручэнні Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь міжведамасная камісія.**

Па прыведзеным у дакладной запісцы кіраўніка Адміністрацыі Уладзіміра Макея прыкладу неналежнай работы са зваротамі жыхароў дома № 22 па вуліцы Наганава ў Брэсце прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці начальнік ЖЭС-4. Яму аб'яўлена вымова і ён пазбаўлены прэміі на 100 працэнтаў за ліпень. Акрамя таго, за ўпушчэнні ў арганізацыі работы са зваротамі грамадзян з пачатку года ў Брэсцкай вобласці прыцягнута да дысцыплінарнай адказнасці 95 службовых асобаў гаррайвыканкамаў і аблвыканкама. Пра гэта ў лісце на імя кіраўніка дзяржавы паведаміў старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар.

На Віцебшчыне за несвоечасовае прыняцце мераў па будаўніцтве калодзежа ў вёсцы Замасточча Віцебскага раёна і дачу недакладнай інфармацыі старшыня Шапечынскага сельвыканкама паніжаны ў класе дзяржслужачага тэрмінам на 6 месяцаў. Адзін з намеснікаў старшыні Віцебскага раённага выканаўчага камітэта вызвалены ад займаемай пасады.

Па выніках праверкі ў Светлагорскім раёне прыцягнуты да адказнасці 8 чыноўнікаў. У Мазырскім раёне загадам па ўстанове «Мазырская цэнтральная гарадская паліклініка» пакараныя дзве службовыя асобы. І хоць агульная колькасць зваротаў грамадзян на Гомельшчыне змяншаецца, усё ж факты валакіты і бюракратызму прысутнічаюць. За першае паўгоддзе па вобласці меры дысцыплінарнага і матэрыяльнага ўздзеяння былі прыменены да 85 службовых асобаў.

На пасяджэнні Гродзенскага аблвыканкама, па выніках праверкі, звернута ўвага першага намесніка старшыні аблвыканкама І. Жука (працуе на пасадзе з красавіка 2009 года) на меўшыя месца ў 2006-2007 гадах парушэнні зямельнага заканадаўства на тэрыторыі Гродзенскага раёна, а таксама на неабходнасць распрацоўкі комплексу мераў па карэнным паляпшэнні работы ў сферы землекарыстання. Распараджэннем старшыні аблвыканкама аб'яўлена заўвага начальніку землеўпарадкавальнай службы аблвыканкама. Начальніку землеўпарадкавальнай службы райвыканкама аб'яўлена вымова. Дзяржаўная рэгістрацыя правоў на зямельны ўчастак, незаконна дадзены дэпутату Путрышкаўскага сельскага Савета І. Шаматовічу, прызнана несапраўднай. Пазбавілася зямлі, атрыманай з парушэннямі заканадаўства, і спадарыня І. Бараноўская — дзяржаўная рэгістрацыя, праведзеная на падставе рашэння Азёрскага сельвыканкама, прызнана несапраўднай па рашэнні суда.

За дапушчаныя парушэнні вызначанага парадку разгляду зваротаў грамадзян у першым паўгоддзі прыцягнуты да адказнасці 95 службовых асобаў Мінскага абласнога, раённых і Жодзінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў. Што тычыцца фактаў, прыведзеных у запісцы кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, за дапушчаную валакіту, непрыняцце своечасовых мераў па капітальным рамонце жылога дома № 9 па 2-м перавулку Чкалава ў Маладзечне дырэктару УП «Камунальнік» аб'яўлена вымова. Намеснік старшыні Маладзечанскага райвыканкама А. Хлебавец, начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Л. Прыбыванец прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці за фармалізм, недастатковы кантроль за разглядам зваротаў грамадзян.

На Магілёўшчыне за дапушчаныя парушэнні і недахопы, выяўленыя падчас праверкі міжведамаснай групы, прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці 28 работнікаў структурных падраздзяленняў аблвыканкама, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, падначаленых ім арганізацый.

У сталіцы пытанні ўзніклі з выдзяленнем зямельных участкаў для шматдзетных сем'яў. За фармальны падыход да работы па падборы і выдзяленні ўчасткаў названай катэгорыі грамадзян аб'яўлена вымова першаму намесніку кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна А. Шклярыку, в.а. начальніка ўпраўлення жыллёвай палітыкі А. Шэршаню, аб'яўлена заўвага старшыні камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва У. Нікіціну, намесніку кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёна А. Даменікану.

Па сістэме прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі за першае паўгоддзе ў Мінску за недахопы ў рабоце са зваротамі грамадзян прыцягнута да розных відаў адказнасці 365 работнікаў.

**Ул. інф.**

# Ратуйся ад спёкі З РОЗУМАМ!




**СІТУАЦЫЯ з «агнём і вадой» — колькасцю прыродных пажараў і загінулых на вадзе — пакуль застаецца стабільнай. А вось дэградацыя прыродных рэсурсаў у зонах адпачынку ўжо навідавоку.**

Для аператыўнага рэагавання на лясныя пажары ў сталіцы і абласных цэнтрах створаны сем зводных атрадаў. Нягледзячы на экстрэмальна цёплае надвор'е, колькасць лясных, кустовых, тарфяных пажараў сёлета не дасягнула свайго піку. Нават летась на гэты момант лічба была больш высокай. Паводле слоў **намесніка начальніка Рэспубліканскага цэнтра ўпраўлення і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Аляксандра КАНАВАЛЬЧЫКА**, цяпер у цэлым па краіне назіраецца трэці клас пажарнай небяспекі, па ўсходзе — чацвёрты (самы ж небяспечны — пяты клас). Больш за ўсё прыродных пажараў традыцыйна прыпадае на Магілёўскую, Віцебскую і Гомельскую вобласці. Наогул павелічэнне колькасці лясных пажараў характэрнае для гэтага часу года. А «віной» таму ў абсалютнай большасці выпадкаў — неасцярожнае абыходжанне чалавека з агнём.

Істотнае павелічэнне колькасці ахвотных адпачыць ля вады дадало работы ратавальнікам на вадзе. Сёння па краіне працуюць 66 ратавальных станцый. Для адпачынку адведзена 150 зон, падкантрольных гэтым станцыям. Аднак далёка не ўсе грамадзяне імкнуцца адпачываць менавіта ў вызначаных месцах. Між тым, як кажа **старшыня Рэспубліканскага савета Таварыства ратавання на водах Анатоль ГОЛУБ**, у вызначаных зонах адпачынку гінуць адзінкі. Большасць усё ж такі гіне ў месцах, якія не кантралююцца, — у кар'ерах, на каналах, вясковых азёрах, падчас падзення з лодак, павозак, машын, прычым часцей падобныя здарэнні адбываюцца на фоне папярэдняга злоўжывання алкаголем. Дарэчы, у 1987 годзе, падчас дзеяння так званага «сухога закону», за год патанула 560 чалавек, а ў 1999-м — 1620. Сёлетнія адпаведныя лічбы за летні перыяд ніякіх рэкордаў не дэманструюць.

Рэкордна важкім аказаўся ў гэту спёку падрыў экалагічнай бяспекі шэрагу прыродных комплексаў. Такіх, як возера Свіцязь, напрыклад, 100-метровы пляж якога вось ужо другі месяц аблепліваюць тысячы і тысячы людзей. Калісьці гэта возера было адным з самых празрыстых у краіне, адзначае **начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Наталля МІНЧАНКА**. З яе слоў, возера «падарыла» краіне некалькі відаў унікальных экзэмпляраў расліннасці, дзеля чаго, уласна кажучы, тут і быў зроблены свіцязанскі заказнік. Аднак цяпер возера моцна забруджваецца і імкліва дэградуе. Не дапамагаюць ні штрафныя санкцыі, ні папярэджванні з боку ўпаўнаважаных асобаў. Па вялікім рахунку, падобныя Свіцязі месцы трэба было б нават закрыць для наведвання, аднак пад пагрозай акажуцца дзясяткі іншых цудоўных мясцін, бо наш чалавек па-свойму разумее як дазволы, так і забароны.

Дарэчы, пра нашага чалавека. Вось адпачывальнікі нярэдка скардзяцца на адсутнасць інфраструктуры ў раёне зон адпачынку. Маўляў, машыну няма дзе прыпаркаваць. Гэтым часам апраўдваецца жаданне максімальна блізка пад'ехаць да вады. Аднак у раёне Вячы, скажам, ёсць аўтастаянка на 300 машын. Чаму ж убачыць там можна не больш за дзясятак аўто? Чаму безліч транспартных сродкаў — дзе заўгодна, толькі не ў вызначаным месцы?

Скардзіцца наш чалавек і на адсутнасць у згаданых зонах крамаў ды сметніц. Толькі вось што цікава: адсутнасць крамаў наш чалавек з лёгкасцю кампенсуе — ого-го з якімі торбамі выгружаюцца беларусы на пляжы! Здавалася б, і адваротнае магчыма: прыхапіць з сабой сваё смецце па завяршэнні «фестывалю», каб давезці літаральна да бліжэйшага кантэйнера...

Несумненна, людзі павінны мець магчымасць адпачываць, а прыродныя рэсурсы — не губляць магчымасць выжыць пасля гэтага. Анамальна ж гарачае надвор'е паказала, што адпачываць, не дадаючы нават гучнае слова «культурна», мы не ўмеем.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Нямігу — на паверхню...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Натуральна, усё гэта разам запатрабуе грошай, аднак суразмоўца, не называючы пакуль канкрэтных лічбаў выдаткаў, зазначыў, што «яно таго будзе каштаваць». Цяпер ідзе прапрацоўка нюансаў на ўзроўні архітэктурнага праекта, які прынцыпова ўзгоднены, падрыхтаваныя эскізы, у далейшым праз тэндар будуць вызначаныя падрадныя арганізацыі, якім і будзе даручана правядзенне неабходных запланаваных работ.

Карыстаючыся выпадкам, мы задалі Міхаілу Жыху і пытанне адносна далейшага лёсу будынкаў Нацыянальнага выставачнага комплексу «БелЭкспа», што месціцца зараз на вуліцы Янкі Купалы. Нашым чытачам ён вядомы найперш як месца, адкуль журналісты «Звязды» вядуць свае рэпартажы са шматлікіх выстаў, якія ладзяцца там. Нагадаем, што тэрыторыя, якую цяпер займаюць выставачны комплекс, а таксама размешчаныя побач карпусы 2-й клінічнай бальніцы, перададзены пад забудову замежнаму інвестару.

— Прыкладна ў 2013 годзе ў колішняй вёсцы Шчомысліца пад Мінскам плануецца будаўніцтва новага вялікага выставачнага комплексу, які будзе адпавядаць усім сучасным патрабаванням правядзення буйных экспазіцый — па плошчы, наяўнасці складоў, пад'язных шляхоў, — адказаў галоўны інжынер КУП «Мінская спадчына». — Будаўнічыя работы разлічаныя прыкладна на 1,5 года. Дарэчы, цяперашнія будынкі выставачнага комплексу не будуць механічна знесены, а будуць разабраныя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**З нагоды**

# Дым ад пажараў — супраць тытунёвага дыму

Калі ў найбліжэйшыя дні сітуацыя з забруджваннем паветра ў расійскай сталіцы не палепшыцца, то ёсць шанц, што курцоў у горадзе стане значна менш. Як паведамляе РІА «Навіны», у перыяд задымлення ад тарфяных і лясных пажараў у Маскве рэзка знізіўся попыт на цыгарэты. Прадаўцы тытунёвых шапікаў сцвярджаюць, што такога зніжэння продажу цыгарэтных вырабаў яны ніколі не бачылі. Так, прадавец шапіка побач са станцыяй метро «Арбацкая» расказала журналістам, што калі звычайна да абеду запасы некаторых марак цыгарэт даводзіцца папаўняць, то ў пятніцу (6 жніўня) да гэтага часу не было прададзена ніводнага цэлага блока. Трэба патлумачыць, што 6 жніўня канцэнтрацыя ў паветры забруджвальных рэчываў дасягнула свайго максімуму з моманту пачатку пажараў. Бачнасць на дарогах складае не больш за 100 метраў. Канцэнтрацыя чаднага газу вышэй за максімальна дапушчальныя значэнні ўдвая. Менавіта таму ў Маскве ў апошнія дні рэзка ўзраслі продажы медыцынскіх масак. Уладам нават давялося ўводзіць абмежаванні на іх водпуск — не больш як 10 масак у адны рукі. У сувязі са спякотай і смогам маскоўскія паліклінікі перайшлі на кругласутачны рэжым работы. У бальніцах праводзяцца толькі экстранныя аперацыі. Правядзенне планавых аперацый было адмененае.

У панядзелак на брыфінгу для журналістаў кіраўнік маскоўскага дэпартамента аховы здароўя заявіў, што з-за анамальна высокай тэмпературы і задымлення смяротнасць у Маскве павялічылася ўдвая. Штодня ў расійскай сталіцы паміраюць каля 700 чалавек пры сярэднім паказчыку 360-380 выпадкаў. Павялічылася таксама нагрузка і на службу хуткай дапамогі. Найбольш частыя прычыны выклікаў — абвастрэнні бранхіяльнай астмы і хваробы сардэчна-сасудзістай сістэмы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Увага, кіроўцы!**

# Пад дрэвамі падчас ліўняў і шквальнага ветру ЛЕПШ НЕ ПАРКАВАЦЦА!

**Пра гэта папрасілі папярэдзіць кіроўцаў у Дзяржаўтаінспекцыі МУС Беларусі.**

— Паркавацца лепш як мага далей ад вялікіх, асабліва старых, дрэў, — адзначыў **начальнік службы прафілактыкі і прапаганды бяспекі дарожнага руху спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла» МУС Яўген ЛАПЕЦ**, — бо падчас моцнага ветру дрэва можа паваліцца на вашу аўтамашыну.

Акрамя таго, у складаных дарожных умовах ДАІ рэкамендуе ўключаць блізкае святло фараў, а падчас прыпынку — аварыйную светлавую сігналізацыю. Так іншым удзельнікам дарожнага руху будзе лягчэй прыкмеціць ваш аўтамабіль.

На аўторак сіноптыкі прагназуюць навальніцы і шквальны вецер. У такіх умовах значна пагаршаецца бачнасць. Пыл і хімічныя злучэнні з першымі кроплямі дажджу ператвараюцца ў масленую плёнку, якая значна зніжае счапленне колаў з асфальтам і павялічвае тармазны шлях. Таму, апынуўшыся ў паласе дажджу, неабходна адразу ж знізіць хуткасць і ўтрымацца ад рэзкіх манеўраў і тармажэння.

Акрамя таго, нагадалі ў **аддзеле агітацыі і прапаганды ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама**, да 12 жніўня ўключна ў Мінску аб'яўлена барацьба з няправільнай паркоўкай грузавікоў. Пры выяўленні парушэнняў правілаў стаянкі кіроўцаў велікагрузных аўтамабіляў чакае штраф, а іх кіраўнікам, службовым асобам, будуць выдавацца прадпісанні.

**Надзея ДРЫЛА.**

# Пажары можна папярэдзіць. Усім разам

**За апошнія двое сутак толькі ў лясах Гомельскай і Магілёўскай абласцей агулам адбыўся 21 пажар (16 і 5 адпаведна). Пацярпелі амаль 23 гектары лесу. Затое ў астатніх рэгіёнах, паводле інфармацыі Мінлясгаса, пажараў не было.**

Найбольш буйныя лясныя пажары за выхадныя дні адбыліся на тэрыторыі Горацкага (7 гектараў) і Бабруйскага (4,3 гектара) лясгасаў Магілёўскай вобласці. Асноўная прычына — так званы чалавечы фактар. Дзяржаўная лясная ахова працуе цяпер ва ўзмоцненым рэжыме, таму для тых, хто не прыслухаецца да просьбаў захоўваць пажарную бяспеку ў лясах, варта будзе нагадаць: штраф на парушальнікаў пажарнай бяспекі і рэжыму забароны на наведванне лясоў — ад 25 да 50 базавых велічынеў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Абзац

◢ Са студзеня па ліпень 2010 года на дарогах Беларусі загінуў 501 чалавек. Гэта на 23,9 % менш, чым за аналагічны перыяд 2009 года. Акрамя таго, у розных дарожна-транспартных здарэннях з пачатку года параненыя больш за 3,2 тыс. чалавек (мінус 11,5 %). Па віне п'яных кіроўцаў адбылося 389 ДТЗ (на 33,8 % менш), у якіх загінулі 79 чалавек і 468 параненыя.

◢ **Расіянін выкраў у Аршанскім доследным лясгасе больш за 140 куб. м лесу на Br5,6 млн. Зламыснік 1977 года нараджэння, які жыве ў Смаленскай вобласці, быў затрыманы з доказамі віны пры спробе пераправіць праз мяжу лес, незаконна спілаваны на тэрыторыі Дубровенскага раёна. Устанаўліваюцца хаўруснікі расіяніна.**

◢ Запарожскія супрацоўнікі МНС знялі з казырка 9-павярховага дома 26-гадовага мужчыну, які там заснуў. Адна нага мужчыны ўжо звісала з даху, калі прыбыла пажарная брыгада. Для таго, каб выратаваць спячага, супрацоўнікі МНС абвязалі яго вяроўкамі і паднялі на дах. Мужчына знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення і не змог растлумачыць, якім чынам патрапіў на казырок даху.

◢ **Вызначаныя пераможцы рэспубліканскага конкурсу на лепшую кансерваваную прадукцыю ў Беларусі «Крыштальны яблык». У намінацыі «Агароднінныя кансервы» вызначаныя два пераможцы — КСУП «Брылёва» за зялёны кансерваваны гарошак і ААТ «Гама густу» (Клецкі кансервавы завод) за соус таматны востры. У намінацыі «Садавінавыя кансервы» перамаглі Віцебскі садавінагародніны камбінат за брусніцу, працёртую з цукрам, і Быхаўскі кансервава-гароднінасушыльны камбінат за буяковы джэм. У намінацыі «Сокі і сокаўтрымальная прадукцыя» не было роўных гарбузоваму нектару з мякаццю вытворчасці Баранавіцкага камбіната харчовых прадуктаў. Сярод садавінавых кансерваў для дзіцячага харчавання з аднолькавымі баламі пераможцамі вызначаныя яблычнае пюрэ з вяршкамі «Антошка» («Гама густу») і пюрэ з яблыкаў з аўсянымі крупамі (Віцебскі садавінагародніны камбінат). Сярод агароднінных кансерваў для дзяцей перамагло пюрэ з морквы з рысам з вяршкамі Маларыцкага кансервава-гароднінасушыльнага завода.**

◢ Масквічы могуць адпачыць ад дыму і гару ад падмаскоўных пажараў у 123 цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Цэнтры будуць працаваць з 09:00 да 20:00. У іх масквічы змогуць перадыхнуць ад дыму і гару, папіць гарбату, паглядзець тэлевізар. У выпадку неабходнасці супрацоўнікі цэнтра могуць памераць ціск, даць прафесійную параду. МНС Расіі разлічвае справіцца з тарфянымі пажарамі ў Падмаскоўі за 5-7 дзён. Тым часам, дым ад лясных пажараў дабраўся да Санкт-Пецярбурга. Істотнае задымленне паветра адзначаецца ў горадзе ўпершыню за ўсё лета.

◢ **У Маскве з-за смогу і спякоты ўстаноўлены абсалютны рэкорд смяротнасці. За мінулыя суткі ў расійскай сталіцы памерлі 449 чалавек, гэта ў 4,5 раза больш за сярэдні ўзровень. Калі такая статыстыка захаваецца, то за месяц з-за непагадзі могуць памерці больш за 13 тыс. масквічоў. За восем дзён жніўня спёка і смог забілі 2213 чалавек.**

◢ Тэмпература вады ў некаторых вадаёмах Беларусі, напрыклад у Асіповіцкім вадасховішчы, дасягае 35 градусаў каля берага. У гэтай паласе вады загінулі амаль усе малькі, і спецыялісты нічым не могуць дапамагчы. Яны выказваюць меркаванне, што ў вадаёмах з часам з'явяцца новыя віды рыбаў, якія будуць адаптаваныя да ўмоў надвор'я, якія змяніліся.

## Поўны абзац

◢ **17-гадовая жыхарка Венгрыі разгарнула кампанію па продажы сваёй цнатлівасці. Дзяўчына растлумачыла рашэнне тым, што ёй і яе сям'і неабходна выплаціць даўгі за дом. Па ходзе аўкцыёну юная венгерка адхіліла прапанову выйсці замуж ад нейкага брытанца, заявіўшы, што яшчэ не гатовая да таго, каб стаць чыёйсьці жонкай.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**Страховые полиса** по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу «CORIS» БМ 0217867—0217869, 0223210 **считать недействительными**.

**Крымінал**

# Забойца схаваў ахвяру пад цэментам. Адзінага падазронага шукаюць

*24-гадовы Сяргей Кажура паспеў кінуцца наўцёкі да таго, як да яго завітала міліцыя*

20-гадовая Алена, супрацоўніца турыстычнай фірмы з Вілейскага раёна, знікла 1 чэрвеня. Выйшла з вясковай хаты, якую яна здымала, і не вярнулася. Сваякі напісалі заяву ў міліцыю, дзяўчыну пачалі актыўна шукаць. Падключылі нават сродкі масавай інфармацыі, фотаздымкі Алены надрукавалі на папулярных інфармацыйных інтэрнэт-сайтах.

Міліцыя прапрацоўвала ўсе магчымыя версіі. Першнаперш праверылі, каму Алена магла тэлефанаваць увечары напярэдадні знікнення. Так выйшлі на дваіх мужчын, якія маглі мець дачыненне да справы. У міліцыянераў былі падставы падазраваць аднаго з іх — Сяргея Кажуру. Ён жыў у гэтай жа вёсцы і часта наведваўся да Алены госцем.

Кажура выставіў легенду, згодна з якой дзяўчына ўвогуле з'ехала з вёскі. І пэўны час гэта версія гучала праўдападобна. Кажуру дапытвалі з дапамогай тэхнічных сродкаў, але той трымаўся спакойна, нічым сябе не выдаваў. Ён дзейнічаў звышасцярожна, як кажуць, разлічваў кожны свой крок. Але аднойчы ўсё ж выдаў сябе ў тэлефоннай размове.

Міліцыянеры тут жа выехалі ў вёску, дзе жыў падазроны. Пачалі абшукваць тэрыторыю ля хаты яго бабулі. І ў гаражы натыкнуліся на дзікую знаходку: труп Алены быў засыпаны зямлёй і заліты цэментам.

Сам падазроны кінуўся наўцёкі яшчэ да прыезду міліцыі, зразумеў, што зрабіў памылку. Ён перастаў выходзіць на сувязь са сваякамі. Міліцыя рабіла ўсё магчымае, каб затрымаць Кажуру, але падазроны пакуль знаходзіцца на волі.

— Заведзена крымінальная справа па артыкуле 139 (забойства). Прычыну смерці дзяўчыны называць пакуль не будзем — вынікі ўсіх належных экспертыз пакуль не гатовыя. Вядзецца следства, — паведаміў Сяргей БОРДАК, следчы па асабліва важных справах пракуратуры Мінскай вобласці.

— Адносінаў паміж імі не было ніякіх. У інтэрнэце пісалі пра тое, што ён Алену згвалціў, гэта няпраўда, — распавядае Алена Мікалаеўна, начальніца забітай дзяўчыны. — Каля года ён заходзіў да яе як прыяцель. І аднойчы пабачыў дарагі ноўтбук... Зарэзаў яе і забраў гэты камп'ютар. Банальнае, страшнае забойства...

Знаёмыя Алены распавядалі, што дзяўчына была вельмі мілым чалавекам, больш за ўсё на свеце любіла жывёл. І да людзей ставілася з дабрынёй і даверам, не ўяўляючы, што ў прыяцелі могуць набівацца сапраўдныя вылюдкі.

### ПРЫКМЕТЫ ПАДАЗРОНАГА



Ва ўчыненні наўмыснага забойства (частка 1артыкула 139) падазраецца 24-гадовы Кажура Сяргей Пятровіч. Нарадзіўся і жыў у Маладзечне.

На выгляд 23-24 гады, рост 175-177 сантыметраў, хударлявага целаскладу, валасы прамыя, русыя.

Упраўленне ўнутраных спраў Мінаблвыканкама просіць усіх грамадзян, якім вядома пра месцазнаходжанне Сяргея Кажуры, паведаміць па тэлефонах у Мінску — (017)229 04 11, 229 04 03, 229 05 90, па мабільным тэлефоне на нумар +375 29 665 10 06 альбо ў найбліжэйшы орган унутраных спраў па тэлефоне 102.

Канфідэнцыяльнасць і ўзнагароджанне гарантаваныя.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

## СВЕДЕНИЯ ОБ ОБЪЕКТАХ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, ПОДЛЕЖАЩИХ РАЗГОСУДАРСТВЛЕНИЮ И ПРИВАТИЗАЦИИ

| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | Республиканское унитарное производственное предприятие «Витебский Рассвет», РУПП «Витебский Рассвет», Министерство торговли Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Конструкторское бюро «Дисплей», РУП «КБ «Дисплей», Государственный военно-промышленный комитет Республики Беларусь | Ремонтное республиканское унитарное предприятие «Спецремонт», РУП «Спецремонт», Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь |
|---|---|---|---|
| **Адрес** | 210026, ул. Я. Купалы, 6, г. Витебск | 210605, ул. П. Бровки, 13а, г. Витебск | 220036, Бетонный проезд, 13, г. Минск |
| **Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции** | Пошив и ремонт швейных изделий | Научные исследования и разработки в области естественных и технических наук | Ремонт и строительство предприятий стройматериалов |
| **Планируемые сроки разгосударствления и приватизации** | 3 квартал 2010 года | 3 квартал 2010 года | 4 квартал 2010 года |
| **Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации** | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| **Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение** | Витебский областной территориальный фонд государственного имущества 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38 | Витебский областной территориальный фонд государственного имущества 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 |
| **Численность работающих, чел.** | 128 | 335 | 444 |
| **Срок предъявлений претензий** | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| **Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО, руб.** | 1132252000 | 17243000000 | 6381865600 |
| **Стоимость основных фондов – всего, руб.** | 1576082585 | 7005922953 | 4592719551 |
| **Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га** | 0,3277 | Доля в праве – 7/125 в отношении земельного участка площадью 25,6294 га | 2,6440 |
| **Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, руб.** | нет | 1. Акции ОАО «БПС-БАНК» по Витебской области 1 выпуска в количестве 573 шт. – 266445 руб. 2. Акции ЗАО «МАК-СКАЛА» г. Москва Российской Федерации в количестве 41 шт. – 326009 руб. | 11463700 |
| **Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб.** | нет | 149101306 | нет |
| **Финансовое состояние объекта, руб.: Балансовая прибыль** | 417740201 | 3587488249 | 681935587 |
| **Финансовое состояние объекта, руб.: Задолженность кредиторская** | 52466272 | 4318242836 | 4274261069 |
| **Финансовое состояние объекта, руб.: Задолженность дебиторская** | 631579574 | 1408642295 | 1274477432 |

# МАГІЛЁЎЦЫ РАТАВАЛІСЯ...



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Найбольшая цяга да вады ў магілёўцаў праяўляецца ў пасляпаўдзённы і бліжэйшы да вечара час. І, як ні дзіўна, вялікая гарачыня не спыняе ў многіх адпачывальнікаў жаданне прыкласціся да чаркі. А п'яным, як вядома, любая вада толькі да калена. Начальнік выратавальнай станцыі Аляксей Сталяроў падкрэсліў, што за маладымі кампаніямі і людзьмі нападпітку вядзецца асаблівае назіранне, на п'яных складаюцца пратаколы. У нядзелю нарадамі міліцэйскага патруля было складзена болей за два дзясяткі пратаколаў, але і гэта не спыняла аматараў бахусу, у выніку васьмёра «перагрэтых» здолелі ўбачыць бераг толькі з дапамогаю выратавальнікаў. На шчасце, у дні тэмпературных рэкордаў на Святым абышлося без людскіх ахвяраў.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

**Вада Святога возера, прагрэтая да 24 градусаў, была для многіх ўвасабленнем сапраўднай асалоды. Але толькі не для матарыста-рулявога Грабянёўскай выратавальнай станцыі Ігара ПЯТРОВА і яго калег-выратавальнікаў.**



# ДОБРЫ КАСЕЦ І НА БАЛОЦЕ НЕ РАЗГУБІЦЦА!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Галоўным арганізатарам трэцяга чэмпіянату, як і двух папярэдніх, стаў рэспубліканскі біялагічны заказнік «Спораўскі». Яго дырэктар Вадзім Пратасевіч сказаў, што, па-першае, арганізатары ўжо набраліся вопыту і пастараюцца правесці спаборніцтвы больш дакладна і змястоўна, а па-другое, сам чэмпіянат набывае ўсё большую папулярнасць у рэгіёне. Як толькі размясцілі ў інтэрнэце першую абвестку пра спаборніцтвы па касьбе балота, адразу сталі адгукацца ахвотныя. Болей за дзясятак камандаў сабралася. Асаблівую актыўнасць праявілі гаспадаркі раёна. Сваю каманду прыслаў нават Кобрынскі мясакамбінат. Выказалі гатоўнасць дэманстраваць майстэрства касьбы супрацоўнікі МНС, актывісты грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны», работнікі заказнікаў і таварыстваў паляўнічых і рыбаловаў.

Некалькі камандаў мелі сямейны склад. Так, суседні з мясцовым СВК «Міжлессе» прадстаўлялі кіраўнік гаспадаркі Вячаслаў Ярошчык і яго бацька Сямён Ярошчык. Вячаслаў Сямёнавіч і Сямён Зіноўевіч апранулі прыгожыя вышываныя кашулі, паказваючы тым самым прыклад паважнага стаўлення да спрадвечнай сялянскай працы. Старэйшы Ярошчык у свой час працаваў механікам, загадчыкам майстэрні, галоўным інжынерам калгаса, які цяпер узначальвае сын, і шмат зрабіў для яго механізацыі, для выцяснення ручной працы. Але ж і бацька, і сын у адзін голас гаварылі, што чалавек, які жыве на зямлі, павінен умець усё рабіць, а мужчына адназначна павінен валодаць касой, якія б там сучасныя найноўшыя і наймаднейшыя агрэгаты не прыходзілі на дапамогу чалавеку.

Тым болей, што да балота патрэбен падыход асаблівы. Апошнім часам актыўна загаварылі пра павагу да балота, як крыніцы кіслароду, як лёгкіх цэлых рэгіёнаў і кантынентаў. Пра гэта згадаў у сваёй вітальнай прамове да ўдзельнікаў чэмпіянату намеснік старшыні Бярозаўскага райвыканкама Міхаіл Крэйдзіч. Міхаіл Мікалаевіч зазначыў, што адна з галоўных мэтаў чэмпіянату — менавіта прыцягненне ўвагі да праблемы захавання балота як экасістэмы. Падтрымаў прамоўцу і старшыня таварыства «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Віктар Фянчук, які выказаў спадзяванне, што паважлівае стаўленне да балота дасць магчымасць вяртлявай чаротаўцы ды іншым балотным насельнікам адчуваць сябе больш камфортна і бяспечна.

Прыемна было паслухаць прамову госця мерапрыемства дырэктара каралеўскага таварыства «Ахова птушак Вялікабрытаніі» Майкла Кларка. Спадар Кларк вельмі хораша выказаўся пра асаблівасці дзікай прыроды Беларусі, пра нашы запаветныя мясціны і нагадаў пра неабходнасць цеснага супрацоўніцтва мясцовага насельніцтва, органаў улады, грамадскіх арганізацый на шляху захавання ўнікальнага прыроднага стварэння — балота.

Так, балота стала галоўным героем гэтых пакуль яшчэ не зусім звычайных для нас спаборніцтваў. Пра балота шмат гаварылі мясцовыя людзі, што прыйшлі паглядзець на касьбу. Станаўлюся выпадковым сведкай размовы, калі адзін вясковы дзядок жартам падбівае другога: «А давай, Іван, прадамо каму пакос! Столькі ж сена накасілі. Зараз спаборніцтва закончыцца, каму яно патрэбнае будзе?» — «А будзе карова есці?» — пытаюся. «Каза будзе, — чую кампетэнтны адказ. — А карова... некалі, як мы яшчэ касілі гэта балота, каровы елі, аж давіліся. А цяпер, вядомая рэч, і каровы разбэсціліся, давай ім смачнага сена з канюшынкай ці сеянай травы». Тут у размову ўступаюць жанчыны, згадваюць, як цяжка давалася тое балотнае сена, як яго выносілі на руках, альбо рабілі спецыяльныя прыстасаванні і сушылі падвешаным на жэрдачках. А цяпер вось балота зарастае хмызняком і можа прапасці, калі яго не касіць і не даглядаць. Касіць жа нікому не патрэбна. Таму і наспела неабходнасць купляць спецыяльныя машыны, якія будуць скошваць усю балотную расліннасць разам з хмызняком і прасаваць яе на брыкеты, прыдатныя для паліва.





Бацька і сын ЯРОШЧЫКІ.

Ну а пакуль што некалькі дзясяткаў энтузіястаў паказалі, як можна прыгожа і якасна касіць балота старадаўняй дзедаўскай касой. Камандныя спаборніцтвы праходзілі на 100-метровай дыстанцыі, трэба было скасіць паласу шырынёй у тры метры. Асобныя касцы стартавалі на паласе даўжынёй у 50 метраў. Сёлетняя спёка падсушыла балота. Вады было не так, як на першым чэмпіянаце 2007 года, — па калена, а то і вышэй. Але балота ёсць балота, і пад нагамі хлюпала. У вашага карэспандэнта ёсць вопыт здымкаў балотных спаборніцтваў, таму я бясстрашна ступіла на балота і пайшла далей насустрач касцам, за мной пацягнуліся і калегі. Ды на гэты раз мне пашанцавала знайсці даволі высокую купіну, а вось каляжанка залезла пантофлямі ў рыжую балотную ваду. Але ж вельмі прыемна было першым павіншаваць з фінішам стомленых, мокрых ад поту касцоў, за спінай якіх засталася ладная паласа балотнага чароту і розных іншых траў.

Суддзі з секундамерамі фіксуюць час, спецыялісты здымаюць балы за агрэхі ў касьбе. Звычайныя моманты спаборніцтваў, каб вызначыць лепшых, больш хуткіх і ўмелых. І вось пасля падвядзення вынікаў ушаноўваюцца пераможцы. Першае месца ў камандным турніры заняла каманда заказніка «Званец» Драгічынскага раёна, за імі былі — каманды СВК «Земляроб» і зборная каманда МНС і заказніка «Спораўскі».

А ў асабістым першынстве лепшым стаў Пётр Вярышка, які прадстаўляў заказнік «Спораўскі». Гэты касец-ас працуе ў райаддзеле МНС, дарэчы, тры гады таму ён таксама выйграў першы чэмпіянат па кашэнні балота.

Прызы раздадзеныя, пераможцы абвешчаныя. Апошнія будуць рыхтавацца да сусветнага чэмпіянату па кашэнні балота, які, па даўняй завядзёнцы, праходзіць восенню ў Польшчы. А свята працягвалася яшчэ доўга. Парадаваў добрай песняй народны ансамбль народнай песні «Вінец» Каравяціцкага сельскага Дома культуры. Сярод гасцей свята была заўважана нават парыжанка. 86-гадовая Марыя Люсціг больш за паўстагоддзя жыве ў Парыжы. А родам яна з тутэйшых мясцін. Вось і скарысталася магчымасцю наведаць імпрэзу, калі гасцявала ў сваякоў. Мадам Люсціг сказала, што ёй вельмі спадабаліся і песні, і касцы, нібы ў дзяцінства вярнулася. Нават сімпатычная вядучая мерапрыемства Тамара Каспярчук за нейкі момант узялася за касу, каб падтрымаць удзельнікаў. А юныя гледачы таксама стараліся, калі не пакасіць самастойна, ну хоць бы патрымацца за касу. Адзін з іх яшчэ з задавальненнем рэкламаваў нашу газету.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

*Бярозаўскі раён.*

## Стыхія

## Зрывала дахі

**У выніку моцнага ветру ў мінулую нядзелю, парывы якога дасягалі 24 метраў за секунду, пацярпелі 314 населеных пунктаў у 30 раёнах краіны. Стыхія не зрабіла ніякіх выключэнняў: яе ўдар не абышоў ніводную з абласцей, паведаміў журналісту «Звязды» галоўны аператыўны дзяжурны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.**

Моцны вецер найбольш закрануў Гродзеншчыну і Міншчыну. На тэрыторыі першай вобласці найбольш пацярпелі Зэльвенскі, Шчучынскі, Лідскі, Мастоўскі і Воранаўскі раёны, на тэрыторыі другой — Бярэзінскі, Маладзечанскі, Любанскі, Мядзельскі і Чэрвеньскі раёны.

Усяго, згодна з узгодненымі звесткамі па стане на 14 гадзін панядзелка, у выніку моцнага ветру былі абясточаны 2251 населены пункт, з якіх на азначаны час яшчэ не было адноўлена электразабеспячэнне ў 1023 населеных пунктах. Усяго пашкоджаныя дахі 588 жылых дамоў, з якіх адноўленыя пакуль толькі 6. Не адноўленымі заставаліся пашкоджаныя дахі 27 аб'ектаў сацыяльна-бытавога прызначэння, 9 вытворчых будынкаў, 780 сельскагаспадарчых пабудоў (пераважна дахі цялятнікаў, навесы і інш.).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Шквалістая нядзеля

*Дрэва павалілася на маршрутку, вадзіцель загінуў*

**8 жніўня ў Магілёўскай вобласці ў выніку моцнага ветру адбыліся надзвычайныя здарэнні. Паводле інфармацыі МНС, у Бабруйску дрэва павалілася на маршрутнае таксі, якое стаяла на канцавым прыпынку на вуліцы Светлагорскай. У мікрааўтобусе «Газэль» атрымаў смяротныя траўмы 50-гадовы вадзіцель.**

На момант здарэння пасажыраў у маршрутцы не было. Аўтамабіль атрымаў значныя механічныя пашкоджанні. Цела вадзіцеля давялося дэблакіраваць супрацоўнікам МНС. У Асіповіцкім раёне ўвечары на чыгуначным перагоне «Асіповічы-2 — Ялізава» на рэйкі паваліліся 4 дрэвы. У выніку давялося затрымаць пасажырскі цягнік «Салігорск—Магілёў» на паўтары гадзіны.

Падзенне 17 дрэў на аўтамабільную дарогу мясцовага прызначэння паблізу вёскі Малая Рагожа Асіповіцкага раёна спыніла рух транспарту больш чым на дзве гадзіны.

Моцны вецер пашкодзіў дахі будынкаў у Бабруйскім, Асіповіцкім і Магілёўскім раёнах.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Полымю не далі распаўсюдзіцца

**18 лясных, тарфяных і травяных пажараў ліквідавана за мінулыя выхадныя на тэрыторыі Гомельскай вобласці. Большасць узгаранняў было выяўлена леснікамі, якія вядуць назіранні за лесам з дапамогай відэакамер. 4 выпадкі знойдзены з дапамогай авіятэхнікі, а пра 7 паведамілі, — расказалі у цэнтры прапаганды і навучання Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях. Усе крыніцы небяспекі былі хутка абясшкоджаны. За два дні агонь пашкодзіў каля 25,5 га лесу.**

Акрамя таго, у чатырох раёнах Гомельшчыны: Светлагорскім, Жлобінскім, Калінкавіцкім і Акцябрскім моцны вецер абясточыў 42 населеныя пункты. Са строю былі выведзены 145 трансфарматарных падстанцый. Без электрычнасці засталіся жылыя дамы, 14 сельскагаспадарчых пабудоў, 16 малочнатаварных фермаў. Па звестках на 15 гадзін 9 жніўня, без энергазабеспячэння заставаліся 6 населеных пунктаў Калінкавіцкага раёна, дзе працягваюцца аварыйныя работы.

Між тым, у нядзелю, 8 жніўня, у Гомелі была зарэгістравана самая высокая тэмпература гэтага лета — плюс 38,9 градуса. Гэты паказчык стаў абсалютным максімумам тэмпературы гэтага дня і жніўня ўвогуле. Лета-2010 стала самым спякотным за стагадовы перыяд метэаназіранняў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## З ПАРЫЖА Ў МАСКВУ — ВЕЛАСІПЕДАМ ПРАЗ БЕЛАРУСЬ

У пятніцу ўвечары на памежным пераходзе Варшаўскі мост у Брэсце сустракалі 18 удзельнікаў веламарафону «Парыж — Масква-2010». Мерапрыемства праходзіць пяты год запар, яго арганізатар — еўрапейская арганізацыя «Веласіпед за мір і ўзаемадзеянне паміж народамі». Стартаваўшы 4 чэрвеня ад Эйфелевай вежы ў Парыжы, веласіпедысты праехалі ладны кавалак Еўропы і прыбылі ў Беларусь. Свой прабег яны прысвячаюць 65-й гадавіне вызвалення Еўропы ад фашызму. Таму найперш накіраваліся ў Брэсцкую крэпасць і паклалі кветкі да Вечнага агню.

Фота БЕЛТА.



У нашай краіне да веласіпедыстаў далучыліся 15 брастаўчан. Маршрут удзельнікаў акцыі пралягае праз гарады Кобрын, Драгічын, Іванава, Пінск, Ганцавічы. Там веласіпедысты маюць намер наведаць славутасці і памятныя мясціны. Па Беларусі веласіпедысты праедуць з 6 па 19 жніўня, а фінішуе веламарафон 27 жніўня ў Маскве.

**Яна СВЕТАВА.**

# Вятрак з глыбінкі атрымаў патэнт

**Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці Рэспублікі Беларусь прыняў становучае рашэнне аб выдачы патэнту на цуд — агрэгат, які можа выпрацоўваць энергію адначасова з ветру і сонца.**



Адразу вятрак асацыюецца з высокай мачтай, на якой вертыкальна збоку замацаваны «прапелер». Але ёсць і так званыя гарызантальныя. Гэта ветракі, вінт якіх замацаваны паралельна ўзроўню зямлі.

Як такое можа быць наогул? Навошта гарызантальна замацоўваць «прапелер»? Спецыялісты ведаюць, што такія ветракі таксама добра працуюць і нават больш эфектыўныя ў параўнанні са сваімі вертыкальнымі сабратамі.

Жыхар Віцебскага раёна Марк Рузін разам з сааўтарам з Віцебска запэўніваюць, што іх вятрак вельмі эфектыўны і хутка акупіцца. Яго магутнасці хопіць на тое, каб забяспечыць энергіяй не толькі вясковы дом, але і вялікі катэдж, нават прыдарожную кавярню.

Калі Марк Рузін прыйшоў са сваімі чарцяжамі ў Віцебскі бізнэс-цэнтр, дзе могуць дапамагчы знайсці інвестараў, кіраўнік цэнтра падтрымкі прадпрымальніцтва Леанід Шур таксама адразу не паверыў у тое, што ідэя мае права на рэальнае ажыццяўленне. Але вырашыў падтрымаць вынаходлівага чалавека.

Пачалі разам думаць, як можна давесці эксперыментальную мадэль да серыйнай вытворчасці. І даволі хутка дасягнулі поспеху. Ужо праз некалькі месяцаў плануюць атрымаць патэнт на аўтарскую вынаходку. Створаны бізнэс-план і вядуцца перамовы з інвестарамі, якіх зацікавіла самаробная сістэма па выпрацоўцы энергіі.

### Псіхіятр з «залатымі рукамі»

Марк Рузін у свае 62 гады поўны ідэй. Дарэчы, у Віцебскі раён ён пераехаў з Латвіі.

— Я там узначальваў цэнтр псіхалагічнай дапамогі. Па адукацыі я псіхіятр, — расказвае «Звяздзе» Марк Абрамавіч. — З-за крызісу і дэфолту ў Латвіі псіхалагічныя медыцынскія паслугі сталі карыстацца слабым попытам. Заняўся вытворчасцю мэблі. Але і ў гэтым кірунку ўзніклі праблемы.

У Латвіі, у адрозненне ад Беларусі, рухнула вялікая прамысловая вытворчасць, у цяжкім стане апынуліся малыя фірмы.

***— А чаму вы, псіхіятр, заняліся распрацоўкай ветрака?***

— Я яшчэ ў маладосці пачаў нешта прыдумваць, удасканальваць. Чаму менавіта вятрак? Тэма выпрацоўвання экалагічна чыстай энергіі вельмі надзённая і перспектыўная, на Захадзе даўно атрымала развіццё. І не толькі таму, што перыядычна павышаецца цана на нафту і газ. Простыя людзі хочуць эканоміць на атрыманні электраэнергіі. А такія ўстаноўкі, як прыватныя ветракі, дазваляюць адчуваць сябе незалежнымі ў энергетычным пытанні.

Наш энергаветраагрэгат (ЭВА) якраз дазваляе, фактычна адзін раз патраціўшы грошы на яго набыццё, больш не думаць пра цэны на электраэнергію.

***— Верагодна, вашу ўстаноўку можна назваць адкрыццём?***

— Не. Я дапрацаваў і кардынальна ўдакладніў ужо існуючыя «прататыпы». Аўтарскіх адрозненняў ад існуючых аналагаў шмат. У прыватнасці, наша ЭВА можа паралельна выпрацоўваць энергію ветру і сонца. Сонечныя элементы ўстанаўліваюцца наверсе канструкцыі памерамі 3 на 3 і 2 метры.

ЭВУ можна замацаваць прама на даху збудавання, што, пагадзіцеся, вельмі зручна. А можна ўстанавіць і замест даху. Адпаведна не будзе неабходнасці атрымліваць дазволы на размяшчэнне ўстаноўкі ў «ветраных месцах»...

***— Як працуе вятрак? Як гарызантальна можна злавіць вецер?***

— Спецыяльныя экраны «ловяць» вецер усіх напрамкаў і накіроўваюць на турбіну. Пры гэтым ЭВА працуе без шуму. Выпрацоўвае электрычную энергію ад трох кілават у гадзіну.

### «Вечная» энергія

Дырэктар Віцебскага бізнэс-цэнтра Леанід Шур стаў сааўтарам ЭВА.

— Мы ўжо свой агрэгат прадэманстравалі на кірмашы інавацыйных ідэй у Мінску, які ўпершыню прайшоў сёлета, — расказвае Леанід Міхайлавіч Шур. — Дарэчы, менавіта на інавацыі трэба рабіць у нашай краіне стаўку. Так робіцца ў багатых краінах.

— Адразу ў чытачоў можа ўзнікнуць пытанне: колькі каштуе ўстаноўка, калі захоча нехта набыць яе і паставіць на дах, напрыклад, дачы?

— Мы, вядома ж, усё прыблізна падлічылі. Устаноўка, якая можа выпрацоўваць да 3 кВт у гадзіну, абыдзецца прыблізна ў 8,5 мільёна беларускіх рублёў, 5 кВт — 18 мільёнаў, 10 кВт — 30 мільёнаў.

Акупляецца ЭВА за пару гадоў. Для таго, каб запусціць вытворчасць, трэба каля 200 тысяч долараў. Для нармальнай работы вытворчасці, па нашых падліках, неабходна стварыць каля дваццаці працоўных месцаў.

Планы ў нас вялікія. Калі знойдуцца інвестары, то пасля сертыфікацыі прадукцыі ўстаноўкі можна будзе адпраўляць і на экспарт. Яны будуць вельмі запатрабаванымі і на рынках Еўропы, Азіі, ЗША. Цяпер вядзём перамовы з патэнцыйнымі інвестарамі з Германіі, Літвы, Аўстрыі...

Разлічваем атрымаць частковую дзяржаўную фінансавую дапамогу з фонду падтрымкі прадпрымальніцтва, інавацыйнага фонду. У Віцебскім аблвыканкаме ўжо ведаюць пра ЭВА, адпаведную інфармацыю давялі да патэнцыйных дзяржаўных заказчыкаў.

«Звязда» будзе ўважліва сачыць за тым, як цікавая ідэя стане прабіваць сабе дарогу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# «КАЛІ ЁСЦЬ ЗА ШТО РАБІЦЬ, ДЫК БУДЗЕ І КАМУ...»



**Старшыня СВК «Старасельскае» Аляксандр Пятровіч ТОЛКАЧ** з Крупскага раёна расказаў мне, што яго гаспадарка ўборачную кампанію амаль што завяршыла. Ураджайнасць даволі нядрэнная.

**Алег Аляксеевіч ГАЛАВАЧ** працуе камбайнерам ужо 8-ы сезон. І кожны раз за руль свайго волата-камбайна ён садзіцца з вялікім задавальненнем, паколькі разумее, што яго заробак залежыць толькі ад якасці яго працы. Працоўны дзень складае больш за 12 гадзін у суткі.

— Але ж справа, зразумела, не толькі ў грашах, — кажа ён. — Мне мая праца падабаецца. Я вырас у вёсцы, застаўся тут жыць і працаваць і не шкадую. Прыемна глядзець на збожжа і адчуваць, што яно вырашчана і зжата маімі рукамі. І што, магчыма, нехта там, у горадзе, будзе есці смачны, духмяны хлеб і дзякаваць мне за ўсе прыкладзеныя намаганні. Стамляюся, вядома ж. Але стома гэта прыемная.

***— У такую спёку як працуецца?***

— Горача на вуліцы. Але ж мы працаваць пачынем з самай раніцы, гадзін з шасці дзесьці, калі яшчэ сонейка добра не прачнулася. Выходзім з расою, каб лягчэй зажыналася. Спякотна становіцца ўжо гадзінаў так да 12. Але на сёння гэта не такая вялікая праблема, паколькі ў камбайнах ёсць сістэма клімат-кантроль. Працуе кандыцыянер. Вады больш з сабой бяром у кабіну. Нам выдаюць па дзве бутэлькі на дзень ці мінералкі, ці проста чыстай пітной. Гэта ўжо па асабістым жаданні. Галоўнае да вечара датрываць. А там сонца садзіцца, і працуецца лягчэй. Дадому звычайна вяртаемся ўжо з цёмным. Выходзіць, што цэлы дзень у полі знаходзімся. Гэта, калі без паломак. Спыняем камбайны па два разы на дзень, прачышчаем сіта, каб папярэдзіць узгаранні. Паліваем халоднай вадой, каб ахладзіць матары, ды і ўсю сістэму ў цэлым.

***— А калі зломіцца камбайн, дзе рамантуецеся: у полі ці ў гараж едзеце?***

— Трэба глядзець па сітуацыі. Калі там нешта дробнае, то можна і адразу ж на працоўным месцы адрамантавацца. Дарэчы, тут у нас машына пажарная дзяжурыць на ўсялякі выпадак. Рознае можа здарыцца. Тым больш па такой спякоце. Шланг з маслам можа лопнуць, матор перагрэцца... На маёй памяці, дзякуй богу, няшчасных выпадкаў не здаралася. Ды і наогул у нашым калгасе нічога такога не было. А вось па раёне было некалькі разоў, што камбайны загараліся адразу ў полі. І якраз у спякоту. Таму лепш не рызыкаваць, а паехаць у гараж і там усё спакойна перагледзець, выправіць, каб пасля не давялося бедаваць. Зразумела, у такіх выпадках шкадуеш часу. Бо за прастой і грошы не плацяць, і збожжа само не ўбярэцца. А страта нават аднаго камбайна і няхай на адзін дзень адразу адчуваецца на тэмпах уборачнай.

***— Ці існуе паміж камбайнерамі суперніцтва?***

— Яно-то існуе, але без нейкіх там злых думак. Зарабіць больш кожнаму хочацца, бо ўсім трэба сем'і карміць, дзяцей вось да школьнага сезона рыхтаваць. А на гэта трэба грошы. Але мы заўсёды дапамагаем адзін аднаму. Зламаўся — збіраюцца ўсе камбайнеры і стараюцца рашыць, што лепш зрабіць: у гараж паехаць, ці можна справу на месцы вырашыць. Ды і з кіраўніцтва заўсёды нехта ёсць на полі, яны таксама дапамогуць калі што.

***— На ваш погляд, праца ў калгасе па жніве арганізавана добра?***

— На мой погляд, усё ў нас добра. Нам даецца магчымасць працаваць і зарабляць грошы. Мы павінны яе выкарыстаць. Кіраўніцтва да нас ставіцца з павагай. Ды гэта і зразумела: калі да нас добра, то і мы якасна працаваць будзем. Ежу нам прывозяць па два разы на дзень. Усё гарачае, свежае. Паелі, адпачылі — і за працу. А што яшчэ трэба? Прыязджаюць нават на поле калектывы мастацкай самадзейнасці. Гэта, так сказаць, на падтрымку. Пяць хвілін перакуру можна выкарыстаць і для таго, каб глянуць на гэту самую самадзейнасць. Дарэчы, гэта ідэя раённага кіраўніцтва. Пасля працоўнага дня можна і душ прыняць. У нашым гаражы яго спецыяльна зрабілі для супрацоўнікаў. А па такой спякоце не нашкодзіць лішні раз памыцца.

***— Як думаеце, нашы дзеці ў будучыні будуць мець павагу да працы на зямлі?***

— Спадзяюся, што будуць. У мяне пакуль дзяцей няма. Але калі з'явяцца, то я іх абавязкова прывучу да працы. Буду браць з сабой на жніво і паказваць, як цяжка здабываецца хлеб. Калісьці я са сваім бацькам прыходзіў на мехдвор, залазіў на камбайн і ўяўляў, як некалі таксама буду кіраваць гэтым волатам. Прайшоў час — і вось я тут. Павінен быць прыклад, каб дзеці з маленства зразумелі, што працаваць — гэта не сорамна, а наадварот. Ведаеце, да нас мясцовыя хлапчукі забягаюць часам, так проста, паглядзець. Некаторыя прыходзяць з бацькамі, дапамагаюць рамантаваць камбайны. Хтосьці з бацькам і ў поле выязджае, каб там таксама і за працэсам паназіраць, і дапамагчы, калі што якое.

***— Вы столькі гадзін працуеце. А як жа ж адпачынак?***

— Вось жніво скончым і адпачнём усім калектывам на дажынках *(усміхаецца)*. А так, пасля працоўнага дня спяшаемся, безумоўна, дадому, да сям'і. Ды і з, так сказаць, калегамі можам сабрацца, пасядзець трохі, абмеркаваць падзеі сённяшнія і падумаць аб планах заўтрашніх. Летам асабліва не разгуляешся, шмат працы. Зразумела, база культмасавая ў вёсцы не такая моцная, як у горадзе. Не хапае дамоў культуры, кінатэатраў, клубаў... Але ёсць фантазія. Вось і ратуемся як можам, збіраемся з сябрамі на пікнікі, адпачынак на возеры дзесьці.

***— А чаму вы, як большасць маладых, у горад працаваць не паехалі?***

— Трэба ж камусьці і хлеб расціць. А калі ўсе ў горад збягуць, дык хто ж у вёсцы працаваць застанецца? Малачко, бульбачка, мяса... Усё ж адсюль выходзіць. Я лічу, што калі ёсць праца, то не мае значэння, дзе яе рабіць. Тым больш, што гэтыя землі я з маленства ведаю, душой да іх прырос. Галоўнае, пэўна, заробак. Калі ёсць за што рабіць, дык будзе і каму. Калгасы цяпер змагаюцца за сябе як могуць. Нас трэба падтрымаць. Тады, мне падаецца, паказчыкі могуць быць вышэйшымі ў два-тры разы.

Вось такі ён, чалавек, які кожны дзень змагаецца за хлеб. Менавіта яму мы павінны сказаць дзякуй за тое, што кожны дзень можам мець на стале свежы бохан хлеба. І такіх, як ён, яшчэ цэлая армія па ўсёй краіне.

**На жніве была Наталля БЕЛЬЧАНКА.**
**Фота аўтара.**

# САЛОДКАЯ СЛАЎГАРАДСКАЯ

**Слаўгарадскае СВК «Прысожжа» ў супрацоўніцтве з беларускімі навукоўцамі сёлета вырошчвае моркву і бульбу.**

Гэта гаспадарка раней спецыялізавалася на збожжавых, але цяпер агародніна патрабуецца для новага падраздзялення. Прадпрыемства «Слаўгарадскі харчавік», дзе сушацца розныя харчы, нядаўна стала цэхам «Прысожжа».

На полі плошчай 12 гектараў расце морква гатунку «Ласінавостраўская», якая, чакаецца, дасць ураджай 200 цэнтнераў з гектара.

— Гэта спецыфічная морква з вялікім утрыманнем цукру: калі яе будуць сушыць, то саладкасць не страціцца, — каментуе **галоўны аграном СВК «Прысожжа» Віктар СВІРЫД**. — Яна мае добры смак, харчовыя якасці і не назапашвае радыяцыю. Такі гатунак выбралі навукоўцы з беларускага інстытута агародніцтва. Яны прыязджалі, падабралі глебу і далі сеялку дакладнага пасеву. А таксама разлічылі колькасць угнаенняў, каб у моркве засталося як мага меней астаткавых рэчываў пасля прымянення хімікатаў.



Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

Гэта першы вопыт працы з навукоўцамі ў СВК «Прысожжа». І галоўны аграном кажа, што вынік бачны ўжо цяпер: прадукцыя таварная. Роўныя караняплоды павінны быць даўжынёй не меней за 20 сантыметраў, каб паспяхова прайсці апрацоўку на «Слаўгарадскім харчавіку». Таксама для патрэбаў новага цэха ў гаспадарцы сёлета пасадзілі амаль 100 гектараў бульбы.

**Ілона ІВАНОВА.**

Асабісты інтарэс

# ЯК НЕ ЗГУБІЦЬ СВАЕ ГРОШЫ НА КАРТЦЫ...

**СЁННЯ большасць беларусаў, якія з'яўляюцца ўладальнікамі пластыкавых картак, можа ў любы момант скарыстаць грошы, залічаныя ім на карт-рахунак. І для гэтага не трэба, як раней, спяшацца ў касу ці ў аддзяленне банка. Разам з тым, калі расплачвацца з дапамогай карткі вельмі зручна, то, на жаль, не заўсёды бяспечна. Аднак максімальна знізіць рызыку для ўласных грошай кожнаму пад сілу: уладальніку карткі дастаткова прытрымлівацца некаторых рэкамендацый па бяспечным выкарыстанні банкаўскіх пластыкавых картак, пра якія распавялі ва Упраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі.**


Фота Пятра ФАМІНА.

Адно з галоўных правілаў бяспекі пры карыстанні карткай — захаванне ў тайне ад іншых канфідэнцыяльных звестак: прозвішча, імя трымальніка карткі, нумара і тэрміна яе дзеяння, ПІН-кода, які неабходна запомніць ці, калі гэта цяжка, захоўваць асобна ад карткі. Таму што зламысніку дастаткова перапісаць ваша імя і некалькі камбінацый лічбаў, што маюцца на картцы, каб скарыстацца грашамі для пакупак у тым жа інтэрнэце.

Як адзначаюць у Нацбанку, уладальніку карткі таксама мэтазгодна карыстацца і паслугай SMS-інфармавання. Апошняя дазваляе з дапамогай тэкставага паведамлення на мабільны тэлефон кліента аператыўна інфармаваць яго пра стан яго карт-рахунку (рахунку па ўліку крэдытаў), змяненні астатку па рахунку. Выкарыстанне гэтай паслугі дазволіць не толькі адразу ж даведацца пра несанкцыянаваную трымальнікам аперацыю па карт-рахунку, але і прыняць неабходныя захады для своечасовай блакіроўкі карткі. Пасля ажыццяўлення любых аперацый з выкарыстаннем карткі неабходна захоўваць і атрыманыя карт-чэкі (сліпы) для зверкі з выпіскай з карт-рахунку (рахунку па ўліку крэдытаў), якую трэба рэгулярна атрымліваць для пацвярджэння зробленых аперацый у выпадку ўзнікнення спрэчных сітуацый.

Нават калі картка папала ў чужыя нядобрыя рукі альбо зніклі яе рэквізіты, у вас ёсць усе шанцы расчараваць зламыснікаў — тэрмінова звярнуцца ў службу кліенцкай падтрымкі банка-эмітэнта і выконваць указанні супрацоўніка. Як правіла, згодна з умовамі дагавору паміж трымальнікам карткі і банкам-эмітэнтам, грошы, якія спісалі з вашага карт-рахунку (рахунку па ўліку крэдытаў) у выніку несанкцыянаванага выкарыстання вашай банкаўскай карткі да моманту паведамлення пра гэта банку-эмітэнту, не кампенсуюцца. Для папярэджання такой непрыемнасці неабходна картку заблакіраваць у парадку, які ўстаноўлены дагаворам карт-рахунку (крэдытным дагаворам).

Пры выбары банкамата таксама не зашкодзіць прытрымлівацца пэўных правілаў. Па-першае, пажадана пазбягаць дрэнна асветленых і бязлюдных месцаў. А калі паблізу круцяцца падазроныя асобы, то лепш выбраць іншы час і месца для выкарыстання банкамата. Між іншым, пры правядзенні аперацыі ў банкамаце ці інфакіёску трэба ўважліва агледзець яго на наяўнасць падазроных прыстасаванняў, размешчаных у месцы набора ПІН-кода і ў месцы, прызначаным для прыёму картак: тут не павінна быць прымацаваных пабочных прадметаў (правадоў, міні-відэакамер, накладак на клавіятуру ці картапрымальнік). Калі ж узніклі падазрэнні, — не трэба карыстацца банкаматам (інфакіёскам), і па магчымасці неабходна паведаміць пра свае падазрэнні ў банк, які абслугоўвае гэтае прыстасаванне, па тэлефоне, што ўказаны на прыстасаванні. І, зразумела, не «свяціце» сваю картку навакольным: будзьце асцярожныя, калі незнаёмыя людзі прапаноўваюць дапамогу ў яе выкарыстанні ў банкамаце. У выпадку ўзнікнення цяжкасцяў пры выкарыстанні карткі, не прыслухоўвайцеся да парад іншых і карыстайцеся толькі праверанымі нумарамі тэлефонаў банка-эмітэнта, якія ўказаныя на банкаўскай картцы альбо атрыманыя вамі непасрэдна ў банку. Каб зламысніку было складана ўбачыць, якія кнопкі вы націскаеце, пры ўводзе інфармацыі знаходзьцеся як мага бліжэй да банкамата і ўводзьце ПІН-код сярэднім пальцам рукі (пры гэтым далонь рукі аказваецца раскрытай), а другой рукой закрывайце клавіятуру ад чужых вачэй.

Не менш важнае правіла — не выпускаць з поля зроку картку, нават перадаючы яе ў чужыя рукі ў рэстаранах, барах, магазінах. Пры правядзенні аплаты ў арганізацыях гандлю звяртайце асаблівую ўвагу на дзеянні касіра, калі ён спрабуе правесці вашу картку праз счытвальнае прыстасаванне абсталявання больш за адзін раз. Гэта дазволіць папярэдзіць правядзенне несанкцыянаваных вамі аперацый. Абавязкова пацікаўцеся і прычынай, па якой касіру неабходна паўторна правесці картку праз счытвальнае прыстасаванне. Такой прычынай можа стаць няўдалая спроба злучэння з цэнтрам аўтарызацыі плацежнай сістэмы, а таксама і спроба несанкцыянаванага доступу да персанальных звестак. У абодвух выпадках аперацыя не будзе лічыцца завершанай, картчэк друкавацца не будзе. Пацвярджэнне завяршэння аперацыі (паспяховай ці не) з'яўляецца друкаванне карт-чэка з адпаведным запісам (аплата, аперацыя забароненая, таму што няправільны ПІН-код; аперацыя забароненая, таму што не хапае сродкаў на рахунку і г.д.).

Што датычыцца аперацый з выкарыстаннем карткі ў інтэрнэце, то для аплаты тавараў у сусветным павуцінні спецыялісты раяць выкарыстоўваць асобную банкаўскую картку, прызначаную толькі для гэтай мэты. Прычым лепш выкарыстоўваць інтэрнэт-сайты вядомых кампаній, якія прымяняюць спецыяльныя праграмныя сродкі для абароны інфармацыі аб банкаўскай картцы. Перад тым, як ажыццявіць аперацыю аплаты тавару ці паслуг у сетцы, трэба ўважліва вывучыць умовы пагаднення, што прапануецца, у прыватнасці — усе правілы прадстаўлення паслуг, умовы дастаўкі, вяртання, кампенсацыі тавару, а таксама працэдуру адмены заказу. Не трэба плаціць праз інтэрнэт-сайты, калі інфармацыя аб умовах аплаты на іх прадстаўленая на невядомай уладальніку карткі мове. У выпадку ж узнікнення спрэчнай сітуацыі з арганізацыяй гандлю (сэрвісу) неабходна захоўваць любыя электронныя дакументы, перапіску па электроннай пошце, якая датычыцца вашых спроб вырашэння гэтай сітуацыі з арганізацыяй гандлю (сэрвісу). Акрамя таго, нельга паведамляць свой ПІН-код пры заказе тавараў па тэлефоне ці пошце, уводзіць яго ў форму заказу на сайце гандлёвага пункта: пры ажыццяўленні аддаленых аперацый увод ПІН-кода ніколі не патрабуецца. Не рэкамендуецца рабіць пакупкі ў інтэрнэт- кафэ і іншых агульнадаступных месцах, таму што там могуць быць устаноўленыя праграмы-шпіёны, якія запамінаюць канфідэнцыяльныя звесткі, што ўводзяць уладальнікі картак.

Нарэшце, каб забяспечыць максімальную захаванасць сваіх грошай на картцы, неабходна ўважліва азнаёміцца з памерам камісійнага ўзнагароджання, якое збірае банк за аперацыі, што ажыццяўляюцца з выкарыстаннем банкаўскай карткі. Памер камісійнага ўзнагароджання пры правядзенні адной і той жа аперацыі можа быць розным у банка-эмітэнта і ў іншых банкаў. Акрамя таго, у залежнасці ад краіны знаходжання і банка пры правядзенні аперацыі з выкарыстаннем банкаўскай карткі ва ўстановах банкаў можа ўтрымлівацца дадатковая камісія, пра памеры якой мэтазгодна пацікавіцца ў работніка банка, які вас абслугоўвае, перад ажыццяўленнем аперацыі.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

Прыёмная кампанія-2010

# СЯРЭДНІ КОНКУРС ЦІ ПРАХАДНЫЯ БАЛЫ?

**6 жніўня завяршылася залічэнне на ўсе формы навучання ў ВНУ другога патоку, і ў галоўным адукацыйным ведамстве нашай краіны ўжо аналізуюць першыя вынікі прыёмнай кампаніі 2010 года. На дзённую бюджэтную форму навучання ў беларускія ВНУ залічаны сёлета 25 тысяч 875 чалавек, а прэтэндавалі на «бюджэт» 52 тысячы чалавек, такім чынам сярэдні конкурс на дзённую бюджэтную форму навучання склаў увогуле па краіне прыкладна 2 чалавекі на месца (летась 2,3 чалавекі). На скарочаны тэрмін навучання конкурс быў 1,8 прэтэндэнта на месца (у 2009 годзе — 1,6 чалавека).**

У Міністэрстве адукацыі адзначаюць, што ў шэрагу абласных універсітэтаў сярэдні конкурс быў вышэйшы за сярэдні паказчык па краіне, а таксама вышэйшы за паказчыкі многіх сталічных ВНУ. Такая ж тэндэнцыя назіралася і летась. Гэта можа быць звязана з жаданнем абітурыентаў навучацца бліжэй да дома, а таксама з вострым дэфіцытам месцаў у студэнцкіх інтэрнатах сталічных ВНУ. Напрыклад, у Гомельскім інжынерным інстытуце МНС сярэдні конкурс склаў 5,6 чалавека на месца, у Магілёўскім вышэйшым каледжы МУС — 3 чалавекі, Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя Куляшова — 2,7, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя П. Сухога — 2,6, Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце — 2,6, Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце — 2,3 чалавека.

Сярод сталічных ВНУ самы высокі сярэдні конкурс быў адзначаны ў Камандна-інжынерным інстытуце МНС — 4,9 прэтэндэнта на месца і ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — 4,6. Праўда, трэба мець на ўвазе, што аб рэальнай колькасці ахвотных паступіць на тую ці іншую спецыяльнасць можна меркаваць толькі ў тых ВНУ і на тых спецыяльнасцях, дзе праводзяцца іспыты ўнутры ВНУ. А калі ўсе ўступныя іспыты праводзяцца ў выглядзе ЦТ, а інфармацыя аб ходзе прыёму заяў аператыўна абнаўляецца кожныя тры гадзіны, няма ніякага сэнсу спяшацца ў прыёмныя камісіі маладым людзям з недастаткова высокімі баламі ў сертыфікатах. Такім чынам, аб прэстыжнасці той ці іншай спецыяльнасці сярод моладзі або той ці іншай ВНУ лепш меркаваць, напэўна, па прахадных балах.

Напрыклад, у Беларускім дзяржаўным універсітэце 48 (!) працэнтаў ад агульнай колькасці паступіўшых на дзённую бюджэтную форму навучання (811 чалавек) маюць сумарны бал звыш як 300 балаў. Сярод факультэтаў прыродазнаўчага профілю самыя высокія прахадныя балы зафіксаваныя на спецыяльнасці «камп'ютарная бяспека» — 340 балаў, «актуарная матэматыка» — 338 балаў, «інфарматыка» — 326 і «эканамічная кібернетыка» — 318.

Сярод сацыяльна-гуманітарных спецыяльнасцяў і эканамічных спецыяльнасцяў прахадныя балы наступныя: «міжнароднае права» — 369, «сусветная эканоміка» — 360, «фінансы і крэдыт» — 358.

Найвышэйшы бал, зафіксаваны сёлета ў БДУ, — 388 з 400 магчымых. Гэты вынік прадэманстравала залатая медалістка баранавіцкай гімназіі № 5 Валянціна Хаванская, якая будзе навучацца ў Белдзяржуніверсітэце на спецыяльнасці «мытная справа».

Самы высокі сярэдні бал атэстата (9,4) быў зафіксаваны сярод абітурыентаў Інстытута бізнэсу і менеджменту тэхналогій і эканамічнага факультэта ўніверсітэта. Сярэдні бал атэстата абітурыентаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, факультэта міжнародных адносінаў і юрыдычнага факультэта склаў 9,3.

Без уступных іспытаў у БДУ залічаны 141 чалавек (3,7 працэнта ад агульнай колькасці), у тым ліку 133 пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд і 8 прадстаўнікоў беларускай дыяспары за мяжой. Атрымліваецца, што БДУ сёлета, як, між іншым, і ў папярэднія гады, зноў «зняў вяршкі» і адабраў з прэтэндэнтаў на студэнцкі білет самых матываваных і добра падрыхтаваных абітурыентаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ВА «БЕЛАРУСЬКАЛІЙ» БУДЗЕ ПРЫВАТЫЗАВАНАЕ ЎЖО СЁЛЕТА

**Вытворчае аб'яднанне «Беларуськалій» на працягу гэтага года будзе рэарганізаванае ў акцыянернае таварыства, у якім доля акцый дзяржавы будзе складаць усе 100 працэнтаў. Пра гэта ўчора паведаміў намеснік дырэктара Фонду дзяржаўнай маёмасці Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Уладзімір Кавалеўскі.**

Сёння ўсе падрыхтоўчыя мерапрыемствы па акцыянаванні гэтага найбуйнейшага беларускага экспарцёра знаходзяцца ўжо на завяршальнай стадыі. Гэта прыватызацыя прамысловага гіганта не прадугледжвае льготны продаж акцый прадпрыемства працоўнаму калектыву або абмен гэтых каштоўных папер на чэкі «Маёмасць». Дзяржава мае намер захоўваць ва ўласнасці менавіта стапрацэнтную долю прадпрыемства, каб, пры неабходнасці, мець магчымасць прапанаваць патэнцыйным інвестарам буйны пакет акцый новага акцыянернага таварыства на даволі цікавых умовах для краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ВАРТАВЫЯ СПЯЦЬ У ШАПКУ?

У Гомелі днём з тэрыторыі КСУП «Насеннегандаль», якая знаходзіцца пад відэаназіраннем, невядомы выкраў бензатрымер коштам амаль мільён рублёў. Два кані растварыліся ўначы з ахоўнай малочнатаварнай фермы ў гаспадарцы «Зарэчча» Рагачоўскага раёна. А вось з аб'екта, які будуецца ў Гомелі, раптам зніклі 28 стальных радыятараў ацяплення, камплект кіслародных шлангаў, помпа да свідравальнага станка на агульную суму больш за 3 мільёны рублёў. І гэта пры тым, што тэрыторыя таксама знаходзіцца пад аховай. Адразу знойдзены толькі выкрадальнікі камбікорму з бункера на тэрыторыі свінакомплексу ў ААТ «Бабоўскі» Жлобінскага раёна: 900 кілаграмаў свінячай ежы выкралі тры грамадзяніны, адзін з якіх працаваў на гэтым сельгаспрадпрыемстве.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Логойский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов в Логойском районе, в том числе:**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Стартовая цена, бел. руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Вераги, уч. № 6 623284601101000048 | 0,1540 | 2 381 580 | 1 227 055 |
| 2 | д. Вераги, уч. № 7 623284601101000049 | 0,1542 | 2 384 670 | 1 227 055 |
| 3 | аг. Гостиловичи, уч. № 4 623284601601000161 | 0,1825 | 3 973 836 | 1 227 055 |

Задаток в размере 10 % от начальной стоимости земельного участка перечисляется на р/с № 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения. **Аукцион состоится 16 сентября 2010 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. № 6, ком. № 7.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 13 сентября 2010 года по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6, ком. № 9.

**Контактные телефоны: (01774) 55473, 54350.
Информацию можно найти на сайте www.logoysk.by.**

## Крымінал

### Жыхар Браслаўскага раёна прыгавораны да 25 гадоў за забойства пенсіянеркі

**Пра гэта паведаміла БЕЛТА пракурор аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў па крымінальных справах і аналізу судовай практыкі пракуратуры Віцебскай вобласці Наталля Яроменка.**

Беспрацоўны 25-гадовы жыхар пасёлка Друя, знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення, разам са сваім 22-гадовым таварышам вырашыў абрабаваць дзвюх пенсіянерак, якія пражываюць у суседняй вёсцы Кадаронцы. Позна ўначы, выбіўшы акно ў верандзе, зламыснікі пракраліся ў хату. Прыцягнутая шумам насустрач выйшла 82-гадовая жанчына і, убачыўшы ў руках няпрошаных гасцей нажы, сама прапанавала аддаць усе зберажэнні. Аднак маладыя людзі вырашылі засцерагчы сябе забойствам і нанеслі шматлікія раненні бабульцы, ад якіх яна сканала на месцы.

Другой ахвярай павінна была стаць прыкаваная да ложка 84-гадовая сястра загінулай. Ёй злачынцы таксама нанеслі некалькі ўдараў нажом па шыі. Але параненая жанчына здолела іх падмануць: яна прыкінулася мёртвай, не выдаўшы схаваныя пад матрацам Br6 млн. Рабаўнікі змаглі знайсці толькі Br4,6 млн, з чым і рэціраваліся.

За забойства пенсіянеркі пры абцяжваючых акалічнасцях і разбой 25-гадовы мужчына прыгавораны да 25 гадоў пазбаўлення волі. Яго хаўруснік адразу пасля ўчынення злачынства знік і цяпер знаходзіцца ў вышуку.

Логойский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов в Логойском районе, в том числе:**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Стартовая цена, бел. руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Вераги, уч. № 5 623284601101000047 | 0,1514 | 2 341 370 | 1 227 055 |
| 2 | аг. Гостиловичи, уч. № 2 623284601601000159 | 0,2147 | 4 674 972 | 1 227 055 |
| 3 | аг. Гостиловичи, уч. № 3 623284601601000160 | 0,2026 | 4 411 502 | 1 227 055 |

Задаток в размере 10 % от начальной стоимости земельного участка перечисляется на р/с № 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения. **Аукцион состоится 9 сентября 2010 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. № 6, ком. № 7.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 6 сентября 2010 года по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6, ком. № 9.

**Контактные телефоны: (01774) 55473, 54350.
Информацию можно найти на сайте www.logoysk.by.**

## ЗАГІНУЎ НА СВЯТЫМ ВОЗЕРЫ

38-гадовы жыхар Рагачова падчас купання скокнуў з чатырохметровай вышкі ў возера Святое, што знаходзіцца каля вёскі Стрэнькі Рагачоўскага раёна. Мужчына пашкодзіў сабе пазваночнік і памёр, калі яму аказвалі медыцынскую дапамогу на беразе. Пасля ныiрання ў возеры ў Гомелі палову сутак пакутаваў у бальніцы 42-гадовы мясцовы жыхар. Ён у стане алкагольнага ап'янення ўдарыўся галавой аб дно і атрымаў траўму шыі, несумяшчальную з жыццём. Яшчэ дзевяць чалавек, па большасці — мужчыны ва ўзросце ад 25 да 66 гадоў, у гэтыя выхадныя патанулі ў вадаёмах Гомельскай вобласці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

КІРМАШ адзел рэкламы 287 17 79
штотыднёвы рэкламны выпуск № 21 (646)

**ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ**

**ПРАДАЕЦЦА**

❒ Каляска інвалідная з электрапрывадам.
Тэл. 8 044 754 06 65.

❒ 7 сем'яў пчол, в. Новая Вёска, Стаўбцоўскі раён.
Тэл. 8 029 922 15 63.

❒ Зааненская каза і козачка 4 мес., в. Майск, Бялынецкі раён.
Тэл. 8 022 323 75 50.

❒ Добрая кабыла, г. Валожын.
Тэл. 8 044 789 93 15.

❒ Аўтамабіль «Вартбург» 1990 г.в., 1,3Б, добры стан + запчасткі, або мяняю на самаробны трактар.
Тэл.: 8 029 753 47 72, 8 01717 47 412.

❒ Аўтамабіль «Фальксваген-Пасат» Б-4 1996—97 г.в., 1,9ТДі, універсал, белы перламутр, ц/з, ABS, эл./люк, эл./люстэркі, CD-DVD, 2 гады ў РБ, выдатны стан.
Тэл. 8 029 145 11 97. Цана 4650 у.а. Торг.

❒ 3-пакаёвая каапэратыўная кватэра ў г. Бабруйску, вул. Ульянаўская, д. 42, кв. 82, 1-ы паверх 5-павярховага дома. Тэрмінова. Цана 28 тыс. у.а.
Тэл.: 8 0225 43 28 10, 8 029 336 39 01.

❒ Аўтамабіль ВАЗ-2105 у добрым стане, г. Ліда.
Тэл. 8 01561 21792.

❒ 2-пакаёвая кватэра ў в/ч Станькава Дзяржынскага раёна, 3/5 дома, 47/27/9. 30 км ад Мінска, возера, парк.
Тэл. 8 029 85 40099.

❒ Аўтамабіль «Рэно-Меган» 1999 г.в., 270 тыс. км прабег, 1,6, МКПП, эл./пакет, у добрым стане. 4300 у.а. Торг.
Тэл. 8 029 323 91 09.

❒ Дом вялікі, драўляны ў в. Зорка Глускага раёна, танна.
Тэл.: 8 029 675 31 79, 359 20 43.

**КУПЛЮ**

❒ Трактар МТЗ (2000—2010 г. выпуску), арыгінал, з дакументамі.
Тэл. 8 044 473 68 90.

❒ Аўтамабіль «Аўдзі», «Фальксваген» альбо японскай вытворчасці, можна з дэфектамі.
Тэл. 8 029 771 51 78.

❒ Бярозавыя і дубовыя венікі (для сябе).
Тэл. 8 029 652 78 84.

**РОЗНАЕ**

❒ Мяняю самаробны трактар (рухавік Д-21) на матаблок.
Тэл. 8 029 583 77 27.

❒ У вайсковую часць на сезонную працу патрабуюцца качагары. З/п ад 700 тыс. рублёў. Месца працы: Мінскі раён, н/п Волма, в/ч 41738.
Тэл. 297 12 79.

**ПАТРАБУЕЦЦА**

❒ Тэрмінова адшліфаваць сцены зруба.
Тэл. 8 029 652 78 84 (г. Мінск).

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:**

**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя______ №__________ Выдадзены ____________________

Подпіс ______________ Дата ________

# ЯК ПРАЖЫЦЬ НА ЗАРПЛАТУ МАЛАДОГА СПЕЦЫЯЛІСТА?

## (Рэальныя гісторыі з жыцця)

**У мяне вельмі шмат сяброў — маладых спецыялістаў. Яны настаўнікі і журналісты, мадэльеры-дызайнеры і навуковыя супрацоўнікі разнастайных музеяў... Яны поўныя працоўнага імпэту і жадання змяніць гэты свет да лепшага... Але ёсць у іх адна перашкода — сціплая зарплата. Яна і высакароднае жаданне не падтрымлівае, і імпэт бязлітасна знішчае...**

Малады спецыяліст, калі яму вельмі пашчасціла ўладкавацца на прэстыжнае прадпрыемства або фірму, атрымлівае больш за 500 тысяч беларускіх рублёў. Звычайна яго заробак — хіба што дах над галавой дазваляе аплаціць, асабліва, калі чалавек прыехаў і ўладкаваўся ў вялікім горадзе. Дзяржавай быццам адразу закладзена, што малады спецыяліст — нахлебнік, нейкі непаўнавартасны прафесіянал, які павінен сядзець на шыі ў бацькоў. Чаму? А хіба можна пражыць на такую сціплую зарплату без дадатковай дапамогі?! Давайце пералічым, на што трэба траціцца маладому спецыялісту: аплата інтэрната або, у горшым выпадку, кватэры, калі прадпрыемства не забяспечвае жытлом; аплата камунальных паслуг; харчаванне, лекі, вопратка; аплата праезду ў грамадскім транспарце (у выпадку калі пашчасціла, і цябе не размеркавалі ў такі маленькі населены пункт, што грамадскага транспарту там папросту няма. Інакш прыйдзецца суцяшаць сябе, што на праездзе ты няблага зэканоміў); і, безумоўна, экстранныя расходы, якія з кожным здараюцца, — г.зн. не перашкодзіла б мець нейкія адкладзеныя «надзвычайныя» грошы. А цяпер уявіце, як хутка разыдуцца гэтыя 500 тысяч, не паспеўшы задаволіць і паловы патрэбаў маладога энергічнага спецыяліста...

Мая сяброўка Света працуе мадэльерам-дызайнерам на прадпрыемстве ў Пінску. Яе заробак у сярэднім 500 тысяч. Штомесяц яна плаціць за інтэрнат ад 40 да 60 тысяч бел. руб. у залежнасці ад пары года. Каля 300 тысяч траціць на харчаванне. І што застаецца? Пасутнасці, 150 «свабодных» тысяч, на якія патрэбна апрануцца, падлячыцца і з'ездзіць у госці да бацькоў (узгадайце, колькі каштуюць квіткі на цягнікі і рэйсавыя аўтобусы). І калі б гэтыя самыя бацькі не дапамагалі Свеце, то яе праца пераўтварылася б проста ў выжыванне, а скончылася б напэўна нейкім набытым захворваннем ад недаядання. А што калі бацькі не ў стане дапамагаць свайму дзіцяці — наваспечанаму спецыялісту? Яны ж для таго і адправілі яго вучыцца, каб яно потым грошы зарабляла прыстойныя, галавой думала — вышэйшую адукацыю маючы! Парадокс у тым, што ў нашай краіне (заўважыла, і не толькі я, такую дзіўную заканамернасць) людзі рабочых прафесій і прафесій у сферы абслугоўвання атрымліваюць грошы значна большыя, чым інтэлігентныя маладыя спецыялісты з вышэйшай адукацыяй. Прарабы і афіцыянты, маляры, мерчандайзеры і нават кандуктары атрымліваюць больш, чым настаўнікі і ўрачы. Гаворка тут, дарэчы, не толькі пра маладых спецыялістаў. Бо і настаўнік са стажам атрымлівае каля 800 тысяч максімум. А кандуктар, якім можа стаць любы, — ад мільёна дзвесце (звярніце ўвагу на абвесткі Мінтранса ў тралейбусах). Дык што — мець вышэйшую адукацыю сёння нявыгадна?

Мой сябра Вова працуе ў Магілёве на заводзе інжынерам-праграмістам. Атрымлівае зарплату памерам 400 тысяч бел. руб. Здымае пакойчык за 180 тысяч. Грошай яму катастрафічна не хапае. Асабліва непрэстыжна мець такую зарплату хлопцу: ні сям'ю завесці, ні на правы здаць. Без дапамогі бацькоў пражыць, наогул, немагчыма! У хуткім часе Вова збіраецца змяняць месца працы. «А самае крыўднае, — разважае са мной Вова, — што я спецыяліст з вышэйшай адукацыяй! Дык на чорта тады мне была гэтая адукацыя, калі я такія смешныя грошы атрымліваю. Лягчэй было скончыць які тэхнікум, ды пайсці на будоўлю працаваць. Во дзе цяпер добра зарабіць можна. А тыя, хто галавой працуе, у нас што — непатрэбныя?!».

Мая сяброўка Аня працуе на віцебскім заводзе інжынерам-тэхнолагам. Рупліва працуе трэці год за 380 тысяч, выконваючы той жа аб'ём працы, які іншыя супрацоўнікі (не маладыя спецыялісты) робяць за зарплату тысяч на 300 вышэйшую. Катэгорыю Ані прынцыпова не даюць, што адбіваецца на памеры заробку. Акрамя таго — дыскрымінуюць. «Да нас па размеркаванні прыйшоў новы хлопец, — распавядае Аня. — І паміж ім і мной выбіралі, каго прызначыць старшынёй нашай брыгады. Выбралі навічка. Хоць у мяне і большы досвед працы, затое ён — мужчына».

Мая сяброўка Каця — навуковы супрацоўнік аднаго з мінскіх музеяў. Яе зарплата — у сярэднім 500 тысяч бел. руб. Каця здымае пакойчык за 120 долараў (больш за 360 тысяч бел. руб.), аплата якога «з'ядае» амаль усе сумленна заробленыя ёю грошы. Атрымліваецца, што Каця павінна месяц пражыць на сто з гакам тысяч, якія засталіся ад яе заробку пасля платы за жытло. Нейкая сітуацыя для перадачы пра выжыванне ў экстрэмальных умовах атрымліваецца. Таму Каці мусіць дапамагаць маці, якая працуе настаўніцай... Тут ужо адно з двух: альбо дачка абдзеленая, альбо маці. Усе матулі ў такіх сітуацыях, як правіла, ахвяруюць сваім дабрабытам...

Мой сябра Рэнат працуе ў абласным цэнтры настаўнікам замежнай мовы. Зарплата яго досыць сціплая — каля 400 тысяч бел. руб. Пашчасціла яму, што ён жыве ў бацькоў — на аплату жытла траціцца не трэба. Зрэшты, даросламу юнаку, напэўна, хочацца адчуваць больш свабоды і незалежнасці і мець хоць бы маленькі, але свой аўтаномны куточак, каб не вісець на шыі ў бацькоў. Гаворка пра тое, каб адкладаць грошы на ўласную кватэру і планаваць сям'ю, у выпадку Рэната смешная і балючая. Акрамя таго, праца настаўніка настолькі эмацыйна насычаная, патрабуе шмат сілаў і часу, што недзе падпрацоўваць амаль немагчыма. Дзе выйсце? Пайсці ў іншую школу? Дык там будзе аналагічная сітуацыя... Куды падацца (маладому) спецыялісту з вышэйшай педагагічнай адукацыяй?!

Жнівень — месяц пачатку новага жыцця. 1 жніўня ўсе маладыя спецыялісты краіны выходзяць на працу. І зараз, пакуль я пісала гэты тэкст, яшчэ адна мая сяброўка прыехала адпрацоўваць размеркаванне ў раённай газеце Буда-Кашалёва. Спадзяюся, узровень яе зарплаты будзе хоць збольшага апраўдваць атрыманую вышэйшую адукацыю і нервовую складаную працу журналіста.

**P.S.** *Шаноўныя чытачы, калі ў вас ёсць свае гісторыі, якія могуць падтрымаць альбо аспрэчыць прыведзеныя вышэй, то лістуйце ў рэдакцыю! 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Альбо на электронную пошту: ministrel@tut.by. Магчыма, менавіта ваша гісторыя паслужыць падставай для больш глыбокага асэнсавання тэмы і аналізу сітуацыі!*

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

Краіна здароўя

Выпуск
№ 37 (206)

Першая дапамога

# ПАДАВІЛІСЯ? НЕ ПАНІКУЙЦЕ!

**Выпадкі бываюць розныя... Уявіць хоць бы сітуацыю, калі чалавек падавіўся і не можа ні ўдыхнуць, ні выдыхнуць. Што рабіць? Галоўнае пры гэтым не разгубіцца, не ўпасці ў паніку і не ўпусціць каштоўныя хвіліны, якія, магчыма, могуць каштаваць пацярпеламу здароўя, а часам і жыцця. Бо вядома ж: без доступу ў арганізм паветра ў клетках мозга праз тры хвіліны пачынаюцца незваротныя змены, а яшчэ праз хвіліну надыходзіць смерць.**

Раптоўнае ўдушша, або асфіксія (ад грэч. asphyxia, літаральна — адсутнасць пульсу) узнікае, калі дыхальныя шляхі перакрытыя дробнымі прадметамі, якія выпадкова трапілі туды. Пры гэтым развіваецца кіслароднае галаданне, а ў крыві і тканках назапашваецца лішак вуглякіслаты. **У выніку, калі не прыняць экстранных мераў, чалавек страчвае прытомнасць пры пульсе, які імкліва слабее.**

**Звычайна, калі чалавек падавіўся, навакольныя — з-за элементарнай недасведчанасці, але ў шчырым імкненні дапамагчы — пляскаюць пацярпелага па спіне. Насамрэч гэта смяротна небяспечна: такія дзеянні толькі прасоўваюць чужароднае цела далей у трахею.**

Вы падавіліся? Кашляйце! Гэта натуральная спроба арганізма вывесці іншародны прадмет з дыхальных шляхоў. Чалавеку, які падавіўся ежай або нейкім прадметам і пры гэтым можа дыхаць і моцна кашляць, перашкаджаць не варта.

**Калі праз дзве—тры хвіліны прыступ не праходзіць (асабліва ў дзіцяці), тэрмінова выклікайце «хуткую». А да яе прыезду адзіны выратавальны сродак — знакаміты прыём Хаймліха, названы так у гонар яго вынаходніка, прэзідэнта інстытута ў Цынцынаці, доктара медыцыны Генры Хаймліха.** Маючы ў запасе тры хвіліны і ні секунды не марудзячы, з яго дапамогай можна выратаваць чалавека ад удушша.

Зразумела, спачатку трэба навучыцца адрозніваць усе прыкметы гэтага неадкладнага стану, асвоіць прыём на сабе, затым на членах сям'і, каб у патрэбную хвіліну быць напагатове. Улічыце, што асфіксія патрабуе імгненных і беспамылковых дзеянняў!

**Прыём Хаймліха.** Станьце за спінай пацярпелага (калі ён яшчэ на нагах і не страціў прытомнасці), абхапіце яго рукамі. Сцісніце адну руку ў кулак і тым бокам, дзе вялікі палец, пакладзіце на жывот пацярпелага ніжэй грудной клеткі, але вышэй пупка. Далонь другой рукі пакладзіце на кулак, хуткім штуршком уверх кулак уціскаецца ў жывот. Рукі пры гэтым варта рэзка сагнуць у локцях (але грудную клетку з бакоў не сціскайце).

Пры неабходнасці прыём паўтарыце некалькі разоў, пакуль дыхальныя шляхі не вызваляцца (на гэта паказваюць моцны кашаль, узнаўленне дыхання і нармалізацыя колеру твару, выштурхоўванне вонкі іншароднага цела).

У выпадку асфіксіі ў жанчыны на позніх тэрмінах цяжарнасці, кулаком варта націскаць вышэй — не на жывот, а на сярэдзіну грудзіны, захоўваючы асцярожнасць.

**Каб павялічыць час жыцця клеткі галаўнога мозга пры парушэнні жыццядзейнасці, у першыя ж імгненні пасля страты прытомнасці, абкладзіце галаву пацярпелага чым-небудзь халодным (бутэлькамі з халоднай вадой, лёдам з халадзільніка, пакетам з замарожанай гароднінай і г.д.).**

Можа здарыцца так, што пры асфіксіі каля дарослага нікога, акрамя дзіцяці, няма. Навучаны загадзя прыёму Хаймліха, ён таксама можа аказаць дапамогу. Калі чалавек ляжыць на спіне, маленькі выратавальнік павінен сесці на яго вярхом і выкарыстаць уласную вагу, каб надаць штуршку неабходную сілу. Галава пацярпелага не павінна быць павернутая ў бок: у такім выпадку выдаліць з дыхальнага канала чужароднае цела складана. Патрэніруйцеся гэтаму прыёму з малым (у гульнявой форме).

Прымяніць метад Хаймліха можна і ў дачыненні да сябе, калі нікога няма паблізу. Для гэтага трэба пакласці рукі на жывот так, быццам дапамогу аказвае хтосьці іншы (кулак размешчаны ніжэй грудной клеткі і вышэй пупка), і зрабіць хуткі штуршок унутр і ўверх. Пры неабходнасці — паўтарыце некалькі разоў. Можна скарыстацца і краем стала, і спінкай крэсла, і парэнчамі: патрэбным месцам жывата націскаць на апору.

**Асобна варта сказаць пра аказанне дапамогі дзецям. Апісаны прыём цалкам прыдатны для падлеткаў — з той агаворкай, што трэба сувымераць фізічныя намаганні з ростам і вагой дзіцяці, гэта значыць, некалькі зменшыць іх.**

Пры аказанні дапамогі малым дзецям, якія знаходзяцца ў прытомнасці, сядзьце на крэсла або апусціцеся на адно калена. Дзіця пакладзіце грудзямі на другое калена галавой уніз. Затым, падтрымліваючы яго грудзі адной рукой, другой некалькі разоў рэзка ўдарце па спіне паміж лапаткамі. Памятайце, што ўдары павінны быць не вельмі моцнымі, але і не слабымі. Паўтарайце, пакуль чужароднае цела не вызваліць дыхальныя шляхі.

Яшчэ малое дзіця (калі дазваляе яго вага) можна перавярнуць уніз галавой, трымаючы яго за ногі, і пастукаць па спіне.

Варта быць надзвычай асцярожнымі пры выцягванні пальцам іншароднага прадмета з рота. Рабіць гэта можна толькі ў тым выпадку, калі прадмет дакладна бачны і вы ўпэўнены, што ненаўмысна не запхнеце яго яшчэ далей.

І апошняе. Нават калі іншародны прадмет удалося выцягнуць і чалавек дыхае нармальна, яго неабходна тэрмінова даставіць у бліжэйшую лячэбную ўстанову.

Усё-такі найлепш здароўе — гэта прафілактыка. Некаторыя правілы паводзінаў за сталом, якім нас вучылі бацькі, — выдатны сродак супраць удушша. Напрыклад, не размаўляць з поўным ротам, старанна пержоўваць ежу, не класці ў рот вялікія кавалкі. Адным словам, важна засвоіць залатое правіла: як ем — і глух і нем.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Карысна ведаць

# Вымыць серную пробку можа толькі ўрач

**Не спрабуйце самастойна выдаляць серную пробку з дапамогай запалкі або ватнай палачкі — гэта можа прывесці да траўмы барабаннай перапонкі!**

Калі ў вас непрыемныя адчуванні ў вушах, знізіўся слых, варта звярнуцца да доктара. Магчыма, прычына гэтых сімптомаў — серная пробка, якая ўтварылася ў вушным праходзе.

Сернымі пробкамі называюць вялікую колькасць сакрэту серных залоз разам з адмерлымі клеткамі скуры, халестэрынам, пылам. Утварэнне серы ў вонкавым слыхавым праходзе — натуральны працэс, які азначае, што арганізм правільна выконвае свае функцыі. Сера выпрацоўваецца ў перапончата-храстковым аддзеле і засцерагае скуру вушнога праходу ад пашкоджанняў і запаленняў. Кансістэнцыя сернай пробкі спачатку мяккая, а ў далейшым можа дасягаць шчыльнасці каменя.

Найбольш частая прычына з'яўлення серных пробак — няправільны догляд вушэй. Спрабуючы пазбавіцца ад сернай пробкі, большасць людзей выкарыстоўвае ватныя палачкі, запалкі і шпількі. Але з дапамогай гэтых прылад яны толькі прапіхваюць серу ў глыбіню вуха, дзе яна назапашваецца і ўтварае серную пробку. Захоўваць правілы гігіены вуха неабходна. **Аднак трэба ведаць, што здаровыя вушы самаачышчаюцца (у норме працэс самаачышчэння слыхавых праходаў ажыццяўляецца падчас размовы, жавання), таму выдаляць варта толькі цёмнае карычневае кольца вакол вонкавага слыхавога праходу.**

Серная пробка можа ўтварацца і пры пранікненні ў вуха вады, ад якой сера набрыньвае і непрыемныя адчуванні ўзмацняюцца. Напрыклад, з пачаткам пляжнага сезона колькасць скаргаў на закладзенасць у вушах павялічваецца. Нярэдка падобная праблема ўзнікае пры пападанні ў вуха бруду або пылу. Часцей з гэтым сутыкаюцца людзі, чыя праца звязаная з рамонтам машын, аўтобусаў і г.д. Утварэнню пробак таксама садзейнічаюць вузкасць або звілістасць слыхавога праходу, залішняя прадукцыя серы, калі ачышчэння не адбываецца, і сера «спякаецца» ў шчыльны камяк.

Як гэта праяўляецца? Чалавек у першую чаргу адчувае паніжэнне слыху. Як правіла, гэта адбываецца пасля пранікнення ў вуха вады. Таксама могуць з'явіцца шум, сверб, сухасць, лёгкае паколванне ў вушах, прычына чаго — раздражненне вестыбулярнага апарату. Часам наяўнасць сернай пробкі суправаджаецца галавакружэннем, агульнай слабасцю, млоснасцю і галаўным болем. Вушны боль узмацняецца ўначы, таму паніжэнне слыху і болевыя адчуванні пацыент часцей адзначае раніцай.

Каб выдаліць серную пробку хутка і без болю, лепш звярнуцца да ўрача-оталарынголага, а не спрабаваць рабіць гэта самастойна. Спачатку доктар прамые вуха цёплай вадой, затым агледзіць барабанную перапонку і выдаліць рэшткі вады сухой ватай. Як правіла, пасля такой працэдуры пацыент адчувае палёгку і зноў добра чуе.

Мяккія пробкі выдаляюць прамываннем адразу ж, цвёрдыя рэкамендуюць папярэдне размякчыць — на працягу некалькіх дзён закапваць у вуха сода-гліцэрынавы раствор. Пры гэтым трэба ведаць, што ў выніку дзеяння кропель слых можа часова пагоршыцца за кошт набракання серы. Часам у пацыента бываюць супрацьпаказанні да прамывання. У такіх выпадках пробку выдаляюць з дапамогай спецыяльнага зонда.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Здароўе на талерцы

## АГРЭСТ ПАЛЯПШАЕ РАБОТУ НЫРАК

**Агрэст, які яшчэ называюць «паўночным вінаградам», вядомы ў нашых мясцінах з XII стагоддзя і выкарыстоўваецца як для харчавання, так і з лекавай мэтай. Бялку ў агрэсце ў два разы больш, чым у вінаградзе. А вось цукру амаль у два разы менш.**



Карыснасць агрэсту павышаюць фосфар, жалеза, кальцый, калій, медзь, вітаміны групы В, С, Р, карацін, якія прысутнічаюць у яго складзе. Так, напрыклад, солі калію нармалізуюць скарачальную здольнасць сардэчнай мышцы, фосфар прадухіляе захворванні касцей, а без жалеза немагчымыя многія абменныя працэсы.

Асабліва каштоўным у агрэсце з'яўляецца вітамін Р — ён умацоўвае крывяносныя сасуды. Таму ўжываць гэтыя ягады пажадана людзям, якія пакутуюць ад хвароб сэрца, гіпертаніі, атэрасклерозу, анеміі. Акрамя таго, агрэст рэкамендуецца як мачагонны сродак пры захворваннях нырак і мачавога пузыра.

Як пацвярджаюць шматгадовыя медыцынскія даследаванні, спелы агрэст карысна есці пажылым людзям і дзецям, а таксама хворым з парушэннямі абмену рэчываў і атлусценнем.

Тыбецкія лекары раяць ужываць настой агрэсту для ўмацавання сценак крывяносных сасудаў: 1—2 сталовыя лыжкі ягад заліць шклянкай гатаванай вады і вытрымаць 10 хвілін. Настой можна падсаладзіць мёдам.

## ЖМЕНЬКА ЧОРНЫХ ПАРЭЧАК — ТРЫ СУТАЧНЫЯ НОРМЫ ВІТАМІНУ С

**У чорных парэчках змяшчаецца да 16 % цукру, 4 % арганічных кіслот, вітаміны С, групы В, Р, карацін, эфірныя алеі, пекцін, дубільныя рэчывы, жалеза, калій, магній. Дарэчы, па колькасці вітаміну С (ад 90 да 300 мг/100 г) чорныя парэчкі саступаюць толькі шыпшыне, а па ўтрыманні вітаміну Р — толькі чарнаплоднай рабіне.**

Ягады карысныя пры захворваннях страўнікава-кішачнага тракту, анеміі, парушэннях рытму сэрца, атэрасклерозе, прастудных і інфекцыйных захворваннях. Напрыклад, пры частым кашлі карысна есці чорныя парэчкі ў неабмежаванай колькасці, акрамя таго, можна піць настой пладоў па 1/2—1 шклянцы некалькі разоў на дзень або сок у сумесі з мёдам. Пры хранічным гастрыце (асабліва пры паніжанай кіслотнасці) рэкамендуецца прымаць сок чорных парэчак па 1/2 шклянкі 2—3 разы на дзень.

Духмянае парэчкавае лісце — незаменны інгрэдыент пры саленні, марынаванні агародніны, грыбоў, а часам і садавіны. Ліст чорных парэчак не толькі садзейнічае захаванню натуральнай афарбоўкі сыравіны, але і абагачае прадукты фенольнымі злучэннямі і вітамінам С. Больш за тое, некаторыя знаўцы-гурманы кансервуюць і само лісце. Вось як гэта робіцца. Для кансервавання бяруць буйныя, нягрубыя лісты. Іх старанна мыюць, складваюць і змяшчаюць у шкляны або эмаліраваны посуд. Шчыльна выкладзеныя лісты заліваюць расолам (300 грамаў солі на 1 л вады), посуд завязваюць льняной тканінай і ставяць у халоднае месца на захоўванне. Кансерваванае парэчкавае лісце надае розным стравам асаблівую пікантнасць.

## ЕШЦЕ ПЕРАЦ І ПРЫГАЖЭЙЦЕ

**Перац салодкі — крыніца вітаміну С і бета-карацíну. Прычым зялёны перац утрымлівае больш вітаміну С, у той час як жоўты і чырвоны — больш бета-карацíну. Дуэт «вітамін С + бета-карацін» — смертаносны кактэйль для свабодных радыкалаў. Таксама ён прадухіляе назапашванне халестэрыну, засцерагаючы тым самым ад атэрасклерозу і сардэчных захворванняў.**

Востры смак перцу абумоўлены ўтрыманнем алкалоіду капсаіцыну. Гэтае рэчыва садзейнічае паляпшэнню апетыту, узмацняе выдзяленне страўнікавага соку, стымулюе работу падстраўнікавай залозы, разрэджвае кроў.

Вельмі карысны сок з зялёных пладоў перцу, паколькі ў ім у вялікай колькасці змяшчаецца крэмній, неабходны для росту валасоў і пазногцяў. Перац рэкамендуецца ўжываць актыўным і пасіўным курцам — ён дабратворна ўплывае на колер твару. Можна гэту агародніну прымяняць і вонкава: перац пазбаўляе ад пігментных плямаў.

Акрамя таго, салодкі перац падыходзіць тым, хто «сядзіць на дыеце». Агародніна гэта малакаларыйная, таму яе можна ў вялікай колькасці ўжываць сырой, тушанай, запечанай і г.д. Але трэба мець на ўвазе, што большасць сваіх карысных уласцівасцяў перац захоўвае менавіта ў сырым выглядзе.

**УВАГА!** Нягледзячы на высокую пажыўнасць пладоў, з асцярожнасцю варта ўжываць перац людзям з гіпертаніяй, стэнакардыяй, язвавай хваробай, пры захворваннях кішэчніка, печані і нырак, а таксама пры эпілепсіі і бяссонніцы.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

# Для засцярогі ад грыпу трэба прышчапіць 20 працэнтаў мінчан

**Кіраўнікі 763 сталічных прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый ужо пацвердзілі гатоўнасць выдаткаваць сродкі для правядзення імунізацыі сваіх супрацоўнікаў супраць грыпу. Нагадаем, што ў перадэпідэмічны сезон 2010 года сталічнай санітарна-эпідэміялагічнай службай пастаўлена задача ахапіць супрацьгрыпознымі прышчэпкамі не менш за 20 працэнтаў мінчан, або 370 тысяч чалавек.**

Больш як 11 працэнтаў гараджан будуць ахоплены вакцынацыяй за кошт бюджэтных крыніц фінансавання (70 тысяч чалавек — за кошт сродкаў рэспубліканскага і 140 тысяч чалавек — за кошт сродкаў гарадскога бюджэтаў). За сродкі працадаўцаў плануецца прышчапіць ад грыпу 140 тысяч чалавек і яшчэ 20 тысяч — за кошт уласных сродкаў грамадзян.

Спецыялісты не выключаюць, што эпідэмічны пад'ём захваральнасці на грып і ВРВІ можа распачацца ўжо напрыканцы лістапада ці ў пачатку снежня, хоць раней грыпозныя хвалі звычайна ахоплівалі тэрыторыю Беларусі ў другой палове зімы. У 2009 годзе эпідэмічны пад'ём таксама адбыўся ў нетыповы час — у кастрычніку—лістападзе.

На думку спецыялістаў, у выпадку эпідэмічнага распаўсюджвання новага варыянта віруса грыпу А (так званага свінога грыпу) сустрэцца з ім на працягу эпідэмічнага сезона рызыкуюць каля 20 працэнтаў мінчан. Як паказала вывучэнне стану імунітэту мінчан да вірусаў грыпу, большасць жыхароў сталіцы маюць ахоўныя цітры да сезонных вірусаў грыпу. Так, 57,5 працэнта абследаваных маюць ахоўны імунітэт да вірусаў грыпу A/H3N2; 35,9 працэнта — да грыпу А /H1N1; 26,3 працэнта — да віруса грыпу В і 19,4 працэнта — да пандэмічнага віруса грыпу.

У Мінскім гарадскім цэнтры гігіены і эпідэміялогіі запэўніваюць, што эканамічны эфект ад прымянення супрацьгрыпозных вакцын у 10-20 разоў перавышае выдаткі на вакцынацыю. Для таго, каб рэальна засцерагчы сваіх супрацоўнікаў ад захворвання на грып, а значыць, і абараніць інтарэсы свайго прадпрыемства, кіраўнікам трэба паклапаціцца пра вакцынацыі не менш як 40 працэнтаў работнікаў свайго калектыву. Аналіз эфектыўнасці імунізацыі, праведзенай у 2009 годзе сярод работнікаў 8 прадпрыемстваў Заводскага раёна сталіцы, паказаў, што сярод прышчэпленых супрацоўнікаў захваральнасць на грып была ў 2,6 раза ніжэйшая, чым сярод не ахопленых вакцынацыяй. А захваральнасць на ВРВІ — ніжэйшая ў 2,3 разы. Таксама на фоне праведзенай імунізацыі мела месца зніжэнне колькасці выпадкаў з часовай стратай непрацаздольнасці і зніжэнне сярэдняй працягласці знаходжання на бальнічным лістку ў сувязі з захворваннем на грып і вострыя рэспіраторныя захворванні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Бацькі і дзеці

# ПРА ЯБЛЫНІ І ЯБЛЫКІ, або Як стаць мудрым дарадцам для сваіх дзяцей?

**КАЛІ дзіця прыходзіць да разумення таго, што яго дзеянні маюць наступствы, у тым ліку і для яго самога, калі яно навучаецца адрозніваць дабро ад зла, калі прыходзіць да разумення таго, што ўласны дабрабыт залежыць ад дабрабыту навакольных, калі прыходзіць да ўсведамлення таго, што сацыяльныя нормы носяць агульны характар і вызначаюць узаемаадносіны з навакольнымі, інтарэсы якіх неабходна ўлічваць, то можна прыйсці да высновы, што выхаванне адбылося, грамадства атрымала цудоўнага грамадзяніна. Так кажа дэкан факультэта псіхалогіі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар псіхалагічных навук, прафесар Уладзімір ЯНЧУК, які ў межах наступнага інтэрв'ю хацеў бы данесці да бацькоў некалькі вельмі простых і важных ісцін.**



**— Сёння існуе бясконцае мноства тэхналогій выхавання і навучання. Як зразумець, якая тэхналогія падыдзе твайму дзіцяці?**

— У ідэале найбольш эфектыўнай з'яўляецца дыялагічная тэхналогія, паводле якой раўнапраўныя ўзаемаадносіны будуюцца з улікам асаблівасцяў і магчымасцяў бакоў. Але рэалізацыя гэтай тэхналогіі патрабуе і адпаведнага культурнага акружэння, выхавацеляў, здольных да дыялогу, а такіх надзвычай мала. На жаль, сёння ў выхаванні дамінуюць аўтарытарныя і часта прафесійна дэфармаваныя людзі, якія насаджаюць нормы і занявольваюць індывідуальнасць, будуюць узаемаадносіны ў аднабаковым парадку, трымаюцца логікі, што ёсць толькі адна праўда — іх праўда. Для наладжвання ж дыялагічных адносінаў неабходна ведаць, што ўяўляе сабой унутраны свет дзіцяці, яго інтарэсы, развітасць маўлення, разумовага апарату і многае іншае, што вызначае своеасаблівасць бачання свету. Трэба ўлічваць, што шмат чаго дзіця проста не ведае, а ў нечым разбіраецца лепш за дарослага. Гаварыць пра паспяховасць выхаваўчай тэхналогіі можна тады, калі мы навучылі дзіця многае рабіць, прымаць самастойныя рашэнні, усведамляць іх наступствы, наогул — імкнуцца да самастойнасці. Няхай дзіця набівае гузакі, набывае каштоўны вопыт, няхай вучыцца апранацца, будаваць, прыбіраць дом, абслугоўваць сябе і г. д. Лепш прыходзіць у дарослае жыццё, валодаючы навыкамі самастойнага плавання.

Калі вы заўважаеце, што ў дзіцяці пачало многае атрымлівацца, яно прыходзіць радаснае ад уласных дасягненняў, то можаце лічыць выбар выхаваўчай тэхналогіі апраўданым. Праўда, памятайце і пра тое, што па меры сталення дзіцяці могуць спатрэбіцца і іншыя тэхналогіі. Таму не спыняйце працэс пошуку.

Паспяховая сацыялізацыя павінна ажыццяўляцца праз дэманстрацыю максімальна магчымай колькасці існуючых магчымасцяў і пастаяннай прымеркі іх у дачыненні да сябе і людзей, якія спрыяюць іх актуалізацыі. Сацыялізацыя — гэта пастаянны рух і маніторынг дасягненняў. Таму хадзіце са сваімі дзецьмі ў паходы, рабіце што-небудзь разам, вучыце ўлічваць розныя інтарэсы, тлумачце, чаму трэба рабіць так, а не інакш. Чым больш будзе такіх размоў і сумесных дзеянняў, тым больш зразумелым будзе для дзіцяці навакольны свет і тым больш у яго будзе падстаў для выбару абгрунтаваных рашэнняў.

Задача дарослых — расказаць дзіцяці пра магчымыя наступствы любых рашэнняў, тых затратах, якія яны патрабуюць. Трэба патлумачыць, што мыць рукі варта не таму, што гэта робяць усе ці гэтага хочуць бацькі, а расказаць і паказаць на даступных для разумення дзіцяці прыкладах, да якіх наступстваў могуць прывесці нямытыя рукі. Карысна нават прадэманстраваць пад мікраскопам, што знаходзіцца на нямытых руках. У дзіцяці няма яшчэ разумення цяжкіх наступстваў хваробы, дый само яе разуменне носіць абстрактны характар, у сэнсе — гэта можа мець дачыненне да каго заўгодна, толькі не да яго. Больш за тое, дзіця часта імітуе хваробу толькі таму, што гэта прыводзіць да прыцягнення ўвагі бацькоў, якім не лішне было б быць такімі заўсёды.

**— Як трэба сёння расціць дзяцей у сям'і? На якія асновы павінны абапірацца маці і бацька, бабулі і дзядулі?**

— Яны павінны ўсвядоміць некалькі рэчаў. Першае: дзеці жывуць у іншым сацыякультурным кантэксце. Гэта дзеці іншай літаратуры, мультфільмаў, гульняў, герояў, захапленняў, іншага тэхнічнага акружэння. Другое: тое, што было ў іх дзяцінстве, не зусім падыходзіць для дзяцінства цяперашняга. Калі ў бабулі авалоданне камп'ютарам выклікае вялікія цяжкасці, то ўнук з ім спраўляецца імгненна і нават кваліфікавана. Трэцяе: для таго, каб дасягнуць узаемаразумення з унукамі, не грэх разабрацца ў гульнях, у якія ён гуляе, авалодаць яго слэнгам, арыентавацца ў персанажах любімых кніг і гульняў. Усё гэта будзе спрыяць росту аўтарытэту дарослага ў вачах дзіцяці і фарміраванню агульнай мовы і разумення. Чацвёртае: чым больш вы прывязваеце да сябе дзіця, чым часцей прымаеце рашэнні за яго, тым больш шанцаў для выхавання інфантылізму і ўтрыманства. Памятайце і пра тое, што чалавек, не здольны прымаць самастойных рашэнняў, ніколі не даб'ецца месца пад сонцам у жыцці і будзе ўвесь час вінаваціць навакольных у сваіх бедах і няўдачах. Пятае: колькі ўвагі вы аддавалі сваім дзецям і ўнукам, столькі ж увагі яны будуць даваць вам у будучыні. Шостае: не трэба ахвяраваць сабой дзеля дзіцяці. Ахвяраванне не заўсёды выклікае павагу. Будзьце цікавым чалавекам, які цікавіцца сваім дзіцем. Ваш культурны ўзровень перадасца вашым дзецям і будзе выклікаць інтарэс і павагу. І для таго, каб гэта адбылося, дзяліцеся сваімі праблемамі і развагамі, знаходкамі і няўдачамі, сумненнямі і інтарэсамі. Сёмае: фарміруйце ў сваіх дзяцей пачуццё павагі да навакольных незалежна ад полу, расы, магчымасцяў і меркаванняў. Фарміруйце здольнасць да дыялогу. Сумеснае рашэнне больш трывалае і выверанае, чым індывідуальнае ці навязанае.

**— Дзеці і бацькі павінны быць сябрамі, ці ўсё ж такі паміж імі павінна быць пэўная дыстанцыя?**

— З аднаго боку, наяўнасць сяброўскіх адносінаў выклікае нейкія станоўчыя асацыяцыі. З другога, мы ўсё ж такі не сябры, а бацькі, якія валодаюць пэўнымі правамі і абавязкамі, а дзеці валодаюць сваімі. Безумоўна, дыстанцыя патрэбна. Для мяне ідэал адносінаў — дыялагічныя, якія будуюцца з улікам магчымасцяў, інтарэсаў і асаблівасцяў адно аднаго. У дарослых ёсць тое, чаго няма ў дзяцей, але дзеці валодаюць тым, чаго няма ў нас. Гэта як ва ўзаемаадносінах паміж мужчынам і жанчынай. У гарманічных адносінах жанчына павінна ўзбагачаць мужчыну сваёй жаноцкасцю, а мужчына яе — мужнасцю. Разам ім удаецца аб'яднаць убачанае і адчутае, пабудаваць інтэграванае светабачанне і адчуванне.

**— Якія асноўныя памылкі дапускаюць бацькі ў выхаванні сваіх дзяцей?**

— Нават маючы не адно дзіця і спрабуючы ўлічыць папярэднія памылкі, мы ўсё роўна будзем рабіць іх, паколькі другое дзіця — гэта іншыя праблемы, і тое, што падыходзіла першаму, не заўсёды падыдзе другому. На мой погляд, найбольш фундаментальнай памылкай можна лічыць парушэнне оптымуму ўзаемаадносінаў. Ахвярная і безумоўная любоў можа прывесці да выхавання эгаіста, гіперапека — да фарміравання інфантылізму, аўтарытарнасць, жорсткасць і сухасць — да эмацыйнай чэрствасці і г.д. Не занявольвайце дзяцей у выражэнні пачуццяў і імкненні да пазнання свету, будзьце памяркоўнымі да іх самастойных намаганняў зрабіць штосьці, станьце мудрым дарадцам. Фарміруйце разуменне неабходнасці прытрымлівацца сацыяльных каштоўнасцяў і нормаў, якія рэгулююць узаемаадносіны з навакольнымі і не павінны насіць лакальнага характару. Нельга быць добрым для чалавека патрэбнага і нядобрым для чалавека непатрэбнага. Дабрыня або ёсць, або няма. І калі вы сфарміравалі прагматычнага канфарміста, то гэта можа адгукнуцца і для вас. Калі вы станеце старым і слабым, то можаце стаць абузай для нечуллівага «чада».

**— Што можна сказаць пра асноўныя метады выхавання ў заходніх сем'ях?**

— У кожнай культуры ёсць свае асаблівасці выхавання. Гэтаксама як у кожнай культуры ёсць і свае выдаткі ў выглядзе дзяцей з асацыяльнымі і дэвіянтнымі паводзінамі. Варта памятаць і аб тым, што японская сістэма выхавання разлічана на японскія ўмовы, а амерыканская — на амерыканскія. І не трэба пасыпаць галаву попелам у дачыненні да нашай сістэмы выхавання. У нас вялікае мноства цудоўных і выхаваных людзей, сумленных грамадзян. Праўда, свет глабалізуецца, і ў ім фарміруецца шмат агульнага, якое вызначае характар і своеасаблівасць узаемаадносінаў паміж прадстаўнікамі розных культур.

Хоць, безумоўна, і ў мяне, знаёмага з больш як паўсотняй культур, узнікае адчуванне, што ў нас штосьці робіцца не зусім так. Калі я параўноўваю нашых пяцігодак з іх равеснікамі з Германіі, ЗША, Вялікабрытаніі і іншых краін, то заўважаю істотныя адрозненні. Маленькі амерыканец — гэта цалкам самастойная асоба, здольная да аўтаномных і адказных паводзінаў. Да месца будзе прыгадаць кінафільм «Адзін дома». Калі ў вас сфарміравалася ўяўленне, што фільм прапануе нейкую ідэалізаваную карцінку, якая не адпавядае рэальнасці, то гэта не так. Такіх дзяцей большасць. І выхоўваюцца яны паводле ашчаднага стаўлення да працы і грошай, якія зарабляюцца, а не падаюць з неба. Таму амерыканскі студэнт не сядзіць у бацькоў на шыі, а мые посуд, прыбірае смецце і г.д. Зноў жа хачу падкрэсліць: фарміруйце ў дзяцей самастойныя і адказныя паводзіны. Не ствараце цяплічных умоў, давайце магчымасць спрабаваць і знаёміцца з рознымі бакамі жыцця, не толькі станоўчымі. Можна, вядома, не пускаць дзіця на тусоўку, дыскатэку і думаць, што засцерагаеш яго ад негатыўных наступстваў. Але як бы дзіўна гэта ні прагучала, тым самым вы можаце стварыць праблемы свайму дзіцяці. Па-першае, у яго могуць не скласціся адносіны з равеснікамі з-за яго адарванасці ад «нармальнага» жыцця, па-другое, можа сфарміравацца фецішыраванне гэтых мерапрыемстваў, несвядомая цяга да іх як да забароненага салодкага плода. Па-трэцяе, вы прыгнеціце асобу свайго дзіцяці і станеце пазней віноўнікам усіх яго бед. Ваша дзіця можа цалкам аддаваць сябе вучобе ў школе, ВНУ, аспірантуры, і раптам у 25 гадоў адчуе сваю сацыяльную адзіноту, прыйдзе да высновы, што жыццё прайшло міма. Хто ў гэтым вінаваты? На жаль, для яго вінаватым будзеце вы. Задача бацькоў — не «не пушчаць», а рыхтаваць дзіця да магчымых негатыўных наступстваў, інфармаваць пра магчымыя прыкметы негатыўнага развіцця падзей і спосабах супрацьдзеяння ім. Дзіця павінна адчуваць сваё судачыненне да таго, што адбываецца навокал, а гэта фарміруецца ў сям'і пры непасрэдным удзеле сваякоў. У адрозненне ад нашых сем'яў, прадстаўнікі іншых культур стараюцца вельмі шмат часу бавіць разам з дзецьмі.

**— Як уцягнуць у выхаваўчы працэс мужчын?**

— Уцягванне заўсёды выклікае пачуццё супраціўлення. А вось выхоўваць сваё дзіця сумесна трэба. У нашай культуры ўсё яшчэ прысутнічае стэрэатып, што выхаванне — гэта ўдзел маці, а задача бацькі — ствараць матэрыяльныя ўмовы для сямейнага дабрабыту. Гэты стэрэатып ужо даўно не адпавядае рэальнасці. Па-першае, многія мамы ўжо зарабляюць больш за татаў. Па-другое, мамы часта прыцягваюць татаў да працэсу выхавання ў выглядзе своеасаблівага жупела — вось прыйдзе тата, ён табе задасць. Па-трэцяе, бацькі проста не прывучаны да сумеснага выхавання. У выніку мы назіраем сёння працэс інфантылізацыі і фемінізацыі хлопчыкаў, прывязаных да мамчынай спадніцы, не здольных дэманстраваць мужнасць і маскулінасць. Мамчын сынок шукае сабе мамку ў шлюбныя партнёры. Яму патрэбны апякун і кіраўнік. У выніку нараджаецца шлюб «наадварот», дзе жонка старэйшая за мужа і займае пазіцыю галавы сям'і. Сентэнцыі аб тым, што «яна зачаравала вашага любімага сыночка» — беспадстаўныя. Вы самі сфарміравалі залежнасць у свайго сынка ад сябе самой, манапалізавалі права на прыняцце рашэнняў. Адказнасць за гэта ляжыць і на бацьку, які або слаба ўдзельнічае ў працэсе выхавання, або з'яўляецца ў ім эпізадычна.

Выхаванне — гэта не працэс мэтанакіраванага ўздзеяння на асобу дзіцяці, як гэта пішацца ў традыцыйных падручніках. Гэта працэс саўдзелу членаў сям'і ва ўзаемаразвіцці, узаемападтрымцы і ўзаемаўзбагачэнні. Я прыгадваю прыклад удару па самалюбстве падлетка, які няўдала спрабаваў распаліць вогнішча ў дзявочай кампаніі. У хлопца, дарэчы, быў тата, які любіў гатаваць шашлыкі і цудоўна рабіў гэта. Але тата не прыцягваў сына да справы, не дзяліўся вопытам. Тата лічыў, што сын бачыць, як усё робіцца, і гэтага дастаткова. Аказваецца недастаткова: сыну трэба пра ўсё расказаць у дэталях, даць магчымасць зрабіць самому. Тое ж датычыцца і матуль, якія не прыцягваюць сваіх дачок да прыгатавання ежы.

З якімі пытаннямі прыйшоў «кроха» да бацькі ў вядомай паэме Маякоўскага? «Што такое добра і што такое дрэнна?». У дзіцяці няма адказаў на мірыяды пытанняў. І задача бацькоў — даць рамачныя адказы на іх, патлумачыць, чаму нешта адбываецца, чаму лепей паводзіць сябе менавіта так. Чым больш адказаў, тым лягчэй яму будзе арыентавацца і прымаць абгрунтаваныя рашэнні.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Цікаўцеся адно адным, не падзяляйце сферы ўплыву і заслугі, давайце адзін аднаму ўзоры ўзаемаадносінаў, падтрымлівайце спробы татаў займацца са сваімі сынамі, перадаваць ім свой вопыт, не ператварайце працэс выхавання ў выкананне абавязкаў, будзьце разам як мага часцей, і ў вашай сям'і ўсё будзе добра.

**— Ці лічыце вы прымальным нараджэнне і выхаванне дзяцей у няпоўнай сям'і, у першую чаргу, у сям'і без таты, паколькі татаў па аб'ектыўных прычынах на ўсіх патэнцыйных мам проста не хапае?**

— Адразу хачу сказаць, што ў няпоўных сем'ях вельмі шмат добра выхаваных дзяцей. Мне вядомыя шматлікія прыклады, калі хлопчыкі з няпоўнай сям'і ператвараліся ў сапраўдную апору маці, дапамагалі ёй, станавіліся сапраўднымі мужчынамі. Вядомы і прыклады поўных сем'яў, асобныя прадстаўнікі якіх лепей бы і не з'яўляліся на дзіцячыя вочы наогул. Праблема ўзнікае тады, калі ў дзяцей у няпоўных сем'ях фарміруецца неадэкватнае ўяўленне аб адсутным з бацькоў. Мама можа сфарміраваць у дачкі ўяўленне аб «сапраўдным мужчыну» як зборным ідэале з наборам суперякасцяў. Аднак у рэальным жыцці такога ідэалу проста няма. У чалавеку спалучаюцца вартасці і недахопы, моцныя і слабыя бакі. Да таго ж, засваенне ідэальных узораў мае на ўвазе наяўнасць рэальных мадэляў, прыкладаў увасаблення.

**— Ці дажывём мы да таго часу, калі моцны пол стане мужным, будзе змагацца за ўвагу жанчын і даражыць дзецьмі?**

— Лепей сказаць так: «Ці зможам мы стварыць грамадства, здольнае і зацікаўленае ў вырашэнні гэтай няпростай задачы?». Калі будзем назіраць збоку, чакаць цудаў, то не зможам. Тут і роля СМІ надзвычайная: данесці да навакольных значнасць праблемы і шляхі вырашэння, пераканаўча паказаць, што гэта датычыцца кожнага самым непасрэдным чынам. Можна быць абыякавым, можна фармальна выконваць бацькоўскія і выхаваўчыя абавязкі. Але ж любы з нас рызыкуе сутыкнуцца з недавыхаваным дзіцем, у якога не сфарміраваныя сацыяльныя нормы, адсутнічаюць каштоўнасці, абмежавальныя рэгулятары паводзінаў. Такіх нерэгулюемых хутка можа стаць шмат. І ваш персанальны дабрабыт можа аказацца пад пагрозай.

Трэба фарміраваць уяўленне пра тое, што чалавек, які паважае і цэніць іншых, сам выклікае павагу... Што наяўнасць іншых поглядаў дазваляе паглядзець на праблему з іншага боку, убачыць тое, што было не заўважаным раней... Што аб праблеме трэба гаварыць, а не хаваць яе. І што заўтра да цябе можа вярнуцца зробленае табой сёння.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

